Архіў

РАЗБАЗАРВАНЬНЕ КАРМОУ

і разьмеркаваньне іх па прынцыпах кулацкай ураўнілаўкі працягваюцца

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 201 4105)
Панядзелак 27 ліпеня
1931 г.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА.

НКЗ І КАЛГАСЦЭНТР БССР НЕ ЗАБЯСЬПЕЧЫЛІ НЕАДКЛАДНАГА СПЫНЕНЬНЯ ГРУБЕЙШЫХ СКАЖЭНЬНЯЎ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ І УРАДУ АБ РАЗЬМЕРКАВАНЬНІ ДАХОДАЎ І ВЫДАЧЫ АВАНСАЎ У КАЛГАСАХ

Рашуча змагацца за разьмеркаваньне даходаў і авансаў, выходзячы з колькасьці выпрацаваных кожным калгасьнікам працадзён, супроць „лева“ - апартуністычнай ураўнілаўкі, супроць спроб кулака разбазарваньнем кармоў сарваць кармовую базу калгаснай жывёлагадоўлі

Пакончыць з разбазарваньнем кармоў і кулацкай ураўнілаўкай

«ЗЬВЯЗДА» у нумары ад 23 ЛІПЕНЯ СЫГНАЛІЗАВАЛА АБ РАЗБАЗАРВАНЬНІ КАРМАВЫХ РЭСУРСАЎ І ГРУБЕЙШЫХ СКАЖЭНЬНЯХ ПРЫ ВЫДАЧЫ НАТУРАЛЬНЫХ АВАНСАЎ (у даным выпадку, сена і канюшыны) У КАЛГАСАХ РАДУ РАЁНАЎ. Мы прыводзілі шматлікія ФАКТЫ КУЛАЦКАЙ УРАЎНІЛАЎКІ Ў КОЙДАНАЎСКІМ, ЛЯДНЯНСКІМ І ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКІМ РАЁНАХ І ПАДКРЭСЬЛІВАЛІ НЕАБХОДНАСЬЦЬ САМАГА ТЭРМІНОВАГА РЭАГАВАНЬНЯ З БОКУ ЦЭНТРАЛЬНЫХ ЗЯМЕЛЬНА-КАЛГАСНЫХ ОРГАНАЎ БССР, каб неадкладна спыніць гэтыя агіднасьці, папярэдзіць далейшае пашырэньне такіх недапушчальных скажэньняў дырэктыў партыі і ўраду аб разьмеркаваньні даходаў у калгасах.

«ПРАВДА» у нумары ад 25 ЛІПЕНЯ, характарызуючы гэтыя факты, зусім ПРАВІЛЬНА ПІША, што «ход разьмеркаваньня кармовых рэсурсаў у калгасах некаторых раёнаў сьведчыць аб адсутнасьці партыйнага кіраўніцтва, аб апартуністычных адносінах раду раённых партыйных і савецкіх арганізацый да разьмеркаваньня даходаў у калгасах».

«Урокі Беларусі павінны быць улічаны і іншымі раёнамі, — піша «Правда», — вышэй клясавую пільнасьць у разьмеркаваньні даходаў у калгасах!»

Сёньня мы канстатуем, што рад раённых арганізацый і нават НКЗ і Калгасцэнтр БССР яшчэ належных урокаў з нашых сыгналаў ня вывелі. Аб гэтым даволі ярка сьведчаць паведамленьні з Сіроцінскага і Слуцкага раёнаў, якія мы друкуем у гэтым-жа нумары «Зьвязды».

У калгасе «ЧЫРВОНЫ МАЯК», СЛУЦКАГА РАЁНУ, разбазарваючы кармы, ПАШЛІ ПА ЛІНІІ ВЫКЛЮЧНАГА СКАЖЭНЬНЯ ДЫРЭКТЫЎ АБ РАЗЬМЕРКАВАНЬНІ ДАХОДАЎ У КАЛГАСАХ. Тут мела месца НАГЛАЯ ВЫЛАЗКА КУЛАКА на віду ва ўсіх, нават бяз спроб чымсьці прыкрыць кулацкую дзяльбу, простыя спробы да развалу калгаснай гаспадаркі. ЗАМОЖНІК-ПАЛЯВОД ЯНЧАНКА, разьмяркоўваючы кармы для задавальненьня патрэб кароў, якія знаходзяцца ў індывідуальным карыстаньні калгасьнікаў, рабіў гэта паводле маемаснага прынцыпу: БОЛЬШ МОЦНЫМ ГАСПАДАРОМ ВЫДАВАЛАСЯ ПА 50-60 ПУДОЎ КАНЮШЫНЫ І 20-30 ПУДОЎ СЕНА, А БЯДНЕЙШЫМ — ПА 20-30 ПУДОЎ КАНЮШЫНЫ.

НАСТАЎНІЦА-РАХУНКАВОД— адзіны чалавек, які павінен барацьбу супроць кулацкіх агентаў у гэтым калгасе, — БЫЛА ТЭРАРЫЗАВАНА ПАГРОЗАМІ ЗАБОЙСТВА. ПРАЎЛЕНЬНЕ КАЛГАСУ, салідарызуючыся са сваім паляводам, СТАЛА НА БОК КУЛАКА. Сіроцінскі райкалгассаюз ніяк не рэагаваў на тое, што адбылося ў калгасе «Чырвоны маяк». Самы факт грубейшых скажэньняў пры разьмеркаваньні кармоў у гэтым калгасе сьведчыць аб тым, што СІРОЦІНСКІ РАЙКАЛГАССАЮЗ АПАРТУНІСТЫЧНА АДНЕСЬСЯ ДА ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ УСТАНОЎЛЕНАГА ПРЫКЛАДНАГА ПАРАДКУ РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ДАХОДАЎ У КАЛГАСАХ, КІРУЕ КАЛГАСАМІ НА ПАПЕРЫ.

У калгасе НОВАБЕЛІЦА, СЛУЦКАГА РАЁНУ, праўленьне, ня склаўшы крамовага балянсу і НЕ ЗАБЯСЬПЕЧЫЎШЫ НАВАТ ПАТРЭБ АГРАМАДЖАНАЙ ЖЫВЁЛЫ, ПРЫСТУПІЛА ДА РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ КАРМОЎ СЯРОД КАЛГАСЬНІКАЎ, УЖЫВАЮЧЫ ПРЫНЦЫП КУЛАЦКАЙ УРАЎНІЛАЎКІ. КОЖНАМУ КАЛГАСЬНІКУ, які мае кароў, ВЫДАНА ПА 2 ВАЗЫ КАНЮШЫНЫ, ЗУСІМ НЯ ЎЛІЧВАЮЧЫ КОЛЬКАСЬЦІ ПРАЦАДЗЁН, НАЛІЧАНЫХ ТАМУ ЦІ ІНШАМУ КАЛГАСЬНІКУ.

Такім чынам, РАЗБАЗАРВАНЬНЕ КАРМОЎ І СКАЖЭНЬНІ пры выдачы кармавых рэсурсаў, ПРАЦЯГВАЮЦЦА. КУЛАК ня спыніў сваёй шкодніцкай работы, ІМКНУЧЫСЯ ЎКАРАНІЦЬ ЯДОЦКУЮ СЫСТЭМУ РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ НАТУРАЛЬНАЙ ЧАСТКІ ДАХОДАЎ, ДАБІВАЮЧЫСЯ ЗРЫВУ КАРМОВАЙ БАЗЫ ДЛЯ КАЛГАСНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ, РОБІЦЬ СПРОБЫ ТАКІМІ ШЛЯХАМІ РАЗВАЛІЦЬ КАЛГАСНУЮ ГАСПАДАРКУ.

Такая дзейнасьць кулакоў і падкупачнікаў стала магчымай толькі таму, што РАД РАЁННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ПРАЯЎЛЯЮЦЬ МАХРОВУЮ АПАРТУНІСТЫЧНУЮ НЕДААЦЭНКУ важнейшага зьвяна месячніка генэральнай праверкі — МАСАВАЙ РАБОТЫ ПА ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ПРЫКЛАДНАГА ПАРАДКУ РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ прыбыткаў у калгасах, РАБОТЫ ПА ЎКАРАНЕНЬНІ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ І НАЛАДЖАНЬНЯ ЎЛІКУ ПРАЦЫ.

ЗНАЧНАЯ ДОЛЯ ВІНЫ ПАДАЕ НА НКЗ І КАЛГАСЦЭНТР БССР, якія выстарчальных мер не прынялі да арганізацыі сапраўды шырокай прапрацоўкі ў калгасных масах парадку разьмеркаваньня даходаў у калгасах.

ДЫРЭКТЫВЫ гэтымі арганізацыямі былі ВЫДАНЫ, але ніякай ПРАВЕРКІ выкананьня НЯМА. Весткі з месц гаворыць аб тым, што ў большасьці калгасаў прыкладны парадак разьмеркаваньня даходаў яшчэ не прапрацаваны і невядомы калгасьнікам.

НКЗ і Калгасцэнтр БССР да сёньняшняга дня яшчэ нават не адгукнуліся на нашы сыгналы аб разбазарваньні кармоў і на факты кулацкай ураўнілаўкі. НКЗ І КАЛГАСЦЭНТР ПРАЙШЛІ МІМА ГЭТЫХ ПАГРАЖАЮЧЫХ СЫГНАЛАЎ. Калгасцэнтр, праўда, 23 ліпеня напісаў адносіну ЛЁЗЬНЕНСКАМУ І КРУПСКАМУ райкалгассаюзам аб неадкладным спыненьні разбазарваньня кармоў і прыцягненьні вінаватых да адказнасьці. Але факты разбазарваньня па іншых раёнах засталіся без рэагаваньня. СУТНАСЬЦЬ, ЗРАЗУМЕЛА, НЯ Ў ТЫМ, ЦІ НАПІСАЎ КАЛГАСЦЭНТР ДВУМ АБО ТРОМ РАЙКАЛГАССАЮЗАМ. СПРАВА Ў ТЫМ, ШТО ОРГАН, ЯКІ КІРУЕ КАЛГАСНЫМ БУДАЎНІЦТВАМ У БССР, НЕДААЦАНІЎ УСЁЙ ВЯЛІЗАРНАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ ВАЖНАСЬЦІ ПЫТАНЬНЯ, НЕ ПАСТАВІЎ ГЭТАЕ ПЫТАНЬНЕ ШЫРОКА. КАЛГАСЦЭНТР НЯ ПРЫНЯЎ МЕР, КАБ МАБІЛІЗАВАЦЬ УВАГУ САМЫХ ШЫРОКІХ МАС КАЛГАСЬНІКАЎ ВАКОЛ ПЫТАНЬНЯЎ ПРАВІЛЬНАГА РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ НАТУРАЛЬНЫХ АВАНСАЎ, МАБІЛІЗАВАЦЬ ГЭТЫЯ МАСЫ НА РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ З КУЛАКОМ І ЯГО АГЕНТУРАЙ, ШТО ІМКНУЦЦА ШЛЯХАМ РАЗБАЗАРВАНЬНЯ КАРМОЎ І ЎСТАНАЎЛЕНЬНЯ КУЛАЦКАЙ УРАЎНІЛАЎКІ РАЗВАЛІЦЬ КАЛГАСЫ. У ГЭТЫМ-ЖА ВІНАВАТ І НКЗ БССР.

Разбазарваньне кармоў і кулацкая ўраўнілаўка пры іх разьмеркаваньні павінны быць неадкладна спынены. «ПРЫ РАЗЬМЕРКАВАНЬНІ КАРМОВЫХ РЭСУРСАЎ У ПЕРШУЮ ЧАРГУ ПАВІННА БЫЦЬ ЗАБЯСЬПЕЧАНА АГРАМАДЖАНАЯ ЧАСТКА ПРАДУКЦЫЙНАЙ РАБОЧАЙ ЖЫВЁЛЫ, А РЭШТА РАЗЬМЯРКОЎВАЕЦЦА ПАМІЖ КАЛГАСЬНІКАМІ ПА КОЛЬКАСЬЦІ ВЫПРАЦАВАНЫХ КАЛГАСЬНІКАМ ПРАЦАДЗЁН З УЛІКАМ НАЯЎНАСЬЦІ Ў ЯГО ПРАДУКЦЫЙНАЙ ЖЫВЁЛЫ». Гэтае ўказаньне чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) павінна стаць адзіным мэтадам разьмеркаваньня кармоў. ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ АБАВЯЗАНЫ ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ЗМАГАЦЦА ЗА ВЫРАЗНАЕ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ГЭТАЙ ДЫРЭКТЫВЫ, ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ ПРЫБЫТКАЎ У КАЛГАСАХ НА АСНОВЕ АПОШНЯЙ ПАСТАНОВЫ НКЗ І КАЛГАСЦЭНТРУ СССР. НКЗ і Калгасцэнтр БССР павінны зараз-жа выправіць свае памылкі.

Трэба даць руйнуючы адпор «леваму» апартуністычным тэндэнцыям да ўраўнілаўкі, якія ўсяляк падтрымліваюцца кулакам. Рашучы ўдар трэба нанесьці па тых, хто праяўляе апартуністычную недаацэнку разьмеркаваньня даходаў у калгасах, выходзячы з колькасьці выпрацаваных кожным калгасьнікам працадзён, якія ігнаруюць выразныя дырэктывы партыі і ўраду па гэтым пытаньні.

РАЗБАЗАРВАЮЦЬ КАРМЫ

СЛУЦАК. У калгасе «Новабелічы» праўленьне груба парушыла дырэктыву НКЗ і Калгасцэнтру СССР аб парадку разьмеркаваньня прыбыткаў у калгасах. Яшчэ ня складзен кармовы баланс, а праўленьне ўже разбазарвае кармы. Калгасьнікам выдана па 2 вазы канюшыны, зусім ня ўлічваючы колькасьці працадзён, выпрацаваных кожным калгасьнікам. Кармовыя авансы выданы на прынцыпе кулацкай ураўнілаўкі, ня ўлічваючы нават патрэб аграмаджанай жывёлы.

У калгасе «Новабеліцы» зьдзельшчына носіць фармальны характар. Зусім ня ўлічваецца якасьць работы. У выніку—зьдзельшчына не дае належнага эфекту. Так, пры возцы канюшны калгасьнікі імкнуцца абагнаць адзін другога толькі па колькасьці—зьвезьці больш вазоў. Атрымалася тое, што возяць вазы па 160-200 кгр., выпрацоўваючы па паўтары-дзьве нормы. Калі-ж улічыць, што нармальная вага возу павінна быць каля 400 кгр., дык кожны калгасьнік выпрацоўвае ня больш 3-х нормы.

Працдысцыпліна ў калгасе не на належнай вышыні. У часе ўборкі канюшыны па 7-8 калгасьнікаў бяруць фурманкі і едуць у млын на цэлыя суткі.

Трэба рашуча ўдарыць па кіраўніцтве калгасаў, якое разбазарвае кармы, дапускаючы кулацкую ўраўнілаўку, і не змагаецца за ўкараненьне сапраўднай зьдзельшчыны.

Трэба вызваліць калгас ад такіх кіраўнікоў, якія праводзяць лінію кулака.

С. БРАНАВІЦКІ.

ПА ЎКАЗЦЫ КУЛАКОЎ

СІРОЦІНА. У калгасе «ЧЫРВОНЫ МАЯК» адбылося разьмеркаваньне канюшыны і сена сярод калгасьнікаў. Кармы выдаваліся на ўтрыманьне кароў, якія знаходзяцца ў індывідуальным карыстаньні калгасьнікаў у той час, як жывёла, знаходзячыся на пашы, зусім не патрабуе сена і канюшыны.

ПРЫ РАЗЬМЕРКАВАНЬНІ КАРМОЎ ДАПУШЧАНЫ АБУРАЮЧЫЯ СКАЖЭНЬНІ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ І УРАДУ Ў ГЭТАЙ ГАЛІНЕ. Разьмяркоўваў канюшыну і сена ПАЛЯВОД калгасу ЯНЧАНКА, які ДА УВАХОДУ Ў КАЛГАС БЫЎ ЗАМОЖНІКАМ і меў цьвёрдае заданьне. Таму ня дзіва, што РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ РАБІЛАСЯ ПА ЯЎНА КУЛАЦКІМ ПРЫНЦЫПЕ І МЕЛА МЭТАЮ ВЫКЛІКАЦЬ НЕЗАДАВАЛЬНЕНЬНЕ асноўнай масы беднякоў і сярэднякоў КАЛГАСАМ. ВЫКОНВАЮЧЫ ЗАКАЗ КУЛАКА, ЯНЧАНКА ПАДЗЯЛІЎ КАЛГАСЬНІКАЎ НА ДЗЬВЕ ГРУПЫ: МОЦНЫМ ГАСПАДАРОМ ВЫДАВАЛАСЯ ПА 50-[illegible] ПУДОЎ КАНЮШЫНЫ І 20-30 П[illegible] СЕНА, А БЯДНЕЙШЫМ—ПА 2[illegible] ПУДОЎ канюшыны.

НА БАРАЦЬБУ з гэтымі спробамі клясавага ворага разбурыць калгас ВЫСТУПІЛА КАЛГАСНАЯ НАСТАЎНІЦА—РАХУНКАВОД. ПАЛЯВОД ПАГРАЖАЕ НАСТАЎНІЦЫ ЗАБОЙСТВАМ, калі яна ня спыніць гэтай барацьбы.

Як паказваюць прыведзныя факты, ПРАЎЛЕНЬНЕ КАЛГАСУ СВАЁЙ БЯЗДЗЕЙНАСЬЦЮ ФАКТЫЧНА ПАКРЫВАЕ ШКОДНІЦКУЮ РАБОТУ ПАЛЯВОДА І ЯГО ПРЫХІЛЬНІКАЎ. Настаўніца аказалася безабароннаю.

Значная частка віны падае на СІРОЦІНСКІ РАЙКАЛГАССАЮЗ. Такое скажэньне дырэктывы аб разьмеркаваньні натуральных авансаў магло здарыцца таму, што райкалгассаюз ня кіруе калгаснай вытворчасьцю, уборкаю ўраджаю, ня цікавіцца папуляризацыяй пастановы НКЗ і Калгасцэнтру аб разьмеркаваньні даходаў у калгасах.

ІСАКАЎ.

Сілас—у кармовы баланс кожнай гаспадаркі

Будаўніцтва ям і траншэй выканана ўсяго на 6,8 проц.

Саўгасы „Бацэвічы“ і „Нясята“ скарачаюць сіласнае будаўніцтва

БЯРЭЦЕ ПРЫКЛАД З РАБОЧЫХ САЎГАСУ „ЛУЦАЎШЧЫНА“, ЯКІЯ ДА 5-га ЖНІЎНЯ АБАВЯЗАЛІСЯ ЗАКОНЧЫЦЬ БУДАЎНІЦТВА ЯМ І ТРАНШЭЯ

ЗВОДКА

аб ходзе сіласнага будаўніцтва на 20 ліпеня

СЭКТАРЫ	Пабудавана ям і траншэй у кбм		
	План	Пабудавана	Проц. выканьня
Саўгасы	337.200	15.980	7
Калгасы	689.480	105.896	11,9
А[illegible]бнікі	580.120	[illegible]430	0,1
Усяго	1.806.800	122.315	6,8

БССР павінна ў гэтым годзе засілаваць ня менш і мільёна тон зялёнай масы. Асноўная маса сілосу будзе закладацца ў ямы і траншэі. Таму на будаўніцтва сіласных ям і траншэй павінна быць зараз зьвернута асаблівая ўвага, бо ў бліжэйшыя дні разгорнецца масавае сіласаваньне.

Весткі аб ходзе сіласаваньня на 20 ліпеня паказваюць, што як саўгасы, так і калгасы злачынна недаацэньваюць значэньне сілосу ў стварэньні кармовай базы.

Саўгасы Белсельтрэсту, якія да канца 1931 году будуць мець каля 83 тыс. дойных кароў, будаўніцтва сіласных вежаў, ям і траншэй выканалі ўсяго ў разьмеры 3,2 проц. Прыгарадныя гаспадаркі выканалі свой план у разьмеры 9,2 проц. Ня лепшая справа і ў Маслатрэсьце — 2,5 проц. Сьвінавод-трэст план сіласнага будаўніцтва выканаў усяго ў разьмеры 4,6 проц. Нагул саўгасы план сіласнага будаўніцтва выканалі ўсяго ў разьмеры 5,4 проц

Ня лепшая справа і па калгасным сэктары. З 889.380 кбм. ям і траншэй пакуль што выкапана толькі 105 тыс. кбм., што складае 11,9 проц. заданьня. Зусім пагражаючая справа ў аднаасобным сэктары, які ня выканаў нават і аднаго процанту плянавага будаўніцтва.

Вышэйпаданыя лічбы паказваюць, ШТО АПАРТУНІСТЫЧНАЕ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ СІЛАСУ Ў НАШЫХ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ САЎГАСАХ І КАЛГАСАХ ЯШЧЭ НЯ ЗЛОМЛЕНА.

Кожны дырэктар саўгасу і старшыня калгасу павінен памятаць, што мала ўбраць сена, сенаўборка гэта толькі пачатак барацьбы за кармы.

Кожная гаспадарка павінна сама сабе забясьпечыць на ўвесь год. Адсюль вывад, што сілас, як сустаўная частка кармовага фонду, павінна заняць адпаведнае месца.

Да 1 жніўня трэба выкапаць 30 проц. пляну сіласаваньня. Таму зараз, скончэньнем сенаўборкі неабходна мабілізаваць разгарнуць сіласнае будаўніцтва — капаньне ям і траншэй.

Замест 20.000 кбм. выкапалі толькі 2.000

Вігомльскі раён — жывёлагадоўчы. Сілас у гармоньным балянсе гэтага раёну павінен заняць значнае месца. Ня гледзячы на гэта, раённыя арганізацыі зусім недаацэньваюць значэньня сіласнага будаўніцтва. Замест 20 тыс. кбм. ям і траншэй на 20 ліпеня выкапана УСЯГО 2 ТЫС. кбм. Інструктар па сіласаваньні пры райкалгассаюзе сіласным будаўніцтвам фактычна ня кіруе.

У справе сіласнага будаўніцтва ў Вігомльшчыне патрэбен самы рашучы пералом.

Алесін.

Апартуністы скарачаюць пляны сіласаваньня

Некаторыя саўгасы трэсту Сьвінавод імкнуцца скарачаць пляны сіласаваньня. Так, саўгас «НЯСЯТА», замест будаўніцтва ям і траншэй на 600 тон сілосу, парашыў пабудаваць толькі на 100 тон. Саўгас «БАЦЭВІЧЫ» паводле пляну павінен засілаваць 390 тон, дырэкцыя-ж саўгасу трымае курс толькі на 189.

Саўгас «ЗАРЭЧЧА» дагэтуль не паведаваў ніводнай сіласнай ямы і трапнават леташняя яма яшчэ не адрамантавана і не ачышчана.

Свой.

Да 5-га жніўня

Завершым уборку дадатковых сенажацяй

Рэдакцыі „Зьвязды“, Белканторы трэсту Сьвінавод

Рабочы калектыў саўгасу «Луцаўшчына» рапартуе, што на 20 ліпеня ўбраны 122 гэкт. сенажаці, што складае 122 проц. пляну, 148 гэкт. сеянных траў — 100 проц. пляну. Застагавана і зьвезена 371 тона сена і канюшыны.

Для поўнага забясьпячэньня саўгасу кармамі рабочы калектыў учыняецца ва ўсесаюзны дэкадніК завяршэньня сенаўборкі, на працягу якога абавязваецца ўбраць 35 гэкт. сенажаці, атрыманых дадаткова з запаснага фонду Лагойскага раёну.

Да 5-га жніўня рабочыя саўгасу абавязваюцца закончыць будаўніцтва сіласных ям, траншэй і вежаў, што дасьць магчымасьць засілаваць 1.049 тон зялёнай масы.

Выклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу сьвінагадоўчыя саўгасы «Ахтынопаль», «Вішнёўку» і «1 мая».

Дырэктар саўгасу БОРТНІК.
Старшыня рабочкому ЧАРЗЙ.
Сакратар парткому ШЭЙНАК.

Рэйд брыгад „Зьвязды“ на ільназаводах

Шырэй хвалю спаборніцтва на ЎДАРНЫХ ПАБУДОВАХ

Сьледуйце прыкладу рабочых-Мсьціслаўскага ільназаводу, якія абавязаліся скараціць тэрмін будаўнічых работ на два месяцы

На 2 месяцы раней вызначанага тэрміну рабочыя Мсьціслаўскага ільназаводу абавязваюцца скончыць будаўніцтва

Ліст рабочых і служачых Мсьціслаўскага ільназаводу да рабочых і служачых ільназаводаў БССР

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

БССР па засеве тэхнічных культур займае значнае месца ў Савецкім Саюзе. Другая бальшавіцкая вясна дала новыя посьпехі і перамогі сацыялістычнаму сэктару сельскай гаспадаркі. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі мы маем перавыкананьне пляну па засеве тэхнічных культур, асабліва ільну.

Мсьціслаўскі раён таксама перавыканаў плян засеву ільну. Гэта патрабуе ад нас ударных тэмпаў пабудовы ільназаводаў. Між тым, на будаўніцтве раду ільназаводаў (Хоцінскі, Бялынкаўскі і інш.) ёсьць вялікія ганебныя прарывы, аб чым сыгналізавала «Зьвязда». Гэтыя прарывы ставяць пад пагрозу пуск ільнапяньковых заводаў у тэрмін.

Наш Мсьціслаўскі завод ідзе не апошнім. Наша заданьне па пабудове вытворчага корпусу да 15 жніўня—на 21-VII выканана на 75 проц. Але нас не здавальняюць такія тэмпы будаўніцтва. Таму мы высоўваем свой сустрэчны плян.

Мы абавязваемся скончыць пабудову галоўнага корпусу замест 15 жніўня — першага жніўня; усе будаўнічыя работы (падсобныя будынкі і г. д.) замест 1-га кастрычніка — скончыць 1-га верасьня. Канчатковы пуск заводу—замест 1-га студзеня 1932 году падрыхтаваць да 7-га лістапада 1931 году.

Для забясьпячэньня свайчасовага выкананьня ўзятых на сябе абавязацельстваў мы:

1. Абвяшчаем сябе ўдарнай пабудовай заводу.
2. З 22-VII да 22-VIII абвяшчаем месячнік штурму.
3. Замацоўваемся на заводзе да канца пабудовы заводу.
4. Ствараем 6 ударных брыгад і заключаем паміж імі сацыялістычнае спаборніцтва.

Мы звярачаемся да ўсіх рабочых, служачых ільназаводаў БССР пасьледаваць нашаму прыкладу і абвясьціць месячнік штурму, асабліва тым заводам, у якіх ганебныя прарывы. Прарывы ліквідаваць, арганізаваўшы работу па-ўдарнаму, абвясьціўшы сябе ўдарнікамі і скараціўшы тэрміны пуску заводаў.

Будаўніцтва ільнапяньказаводаў зьяўляецца ўдарным будаўніцтвам. Закончым-жа яго па-ударнаму. Намечаны плян па апрацоўцы ільну заводамі павінен быць поўнасьцю і свайчасова выкананы. Гэтага чакаюць тэкстыльныя фабрыкі, гэтага чакаюць калгасьнікі, якія перавыканалі плян засеву ільну.

Мы спадзяемся, што рабочыя і служачыя ільнапяньказаводаў БССР адгукнуцца на наш заклік і возьмуць ударныя тэмпы ў будаўніцтве.

Змыць ганебныя плямы прарываў. Выканаць праграму будаўніцтва 3-га рашаючага году. Яшчэ шчыльней згуртавацца вакол камуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам якой пралетарыят у саюзе з працоўным сялянствам з посьпехам будуе і пабудуе сацыялізм.

АГУЛЬНЫ СХОД РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ МСЬЦІСЛАЎСКАГА 2-ХТУРБІННАГА ІЛЬНАЗАВОДУ.

Гомельскі будвучастак чакае самацёчнага прыліву рабочай сілы

Гомельскі будаўнічы вучастак ільнапяньковых заводаў № 4 аб'яднае 7 ільнапяньковых і 2 пяньковых заводы. Будаўніцтва забясьпечана амаль усімі дэфіцытнымі матар'ялямі. Толькі німа адзнэй тоді, якую Ільнапяньказабуд зусім выпусьціў з пляну забясьпячэньня гэтага будаўніцтва. Наяўнасьць будматар'ялаў давала магчымасьць выканаць плян будаўніцтва значна больш. Але на сёньняшні дзень будаўніцтва гэтых заводаў усё-ж такі знаходзіцца ў катастрафічным становішчы.

Напрыклад, на пабудове Уваравіцкага заводу пачалі будаваць з усіх будынкаў толькі адзін галоўны корпус. Да гэтага часу ня было цэглы. Малочнажывёлагадоўчая каапэрацыя мела 60 тысяч штук цэглы, якую яна не скарыстоўвала і не адпускала заводу. Толькі цяпер удалося пераканаць галава цэпаў у неабходнасьці перадачы заводу цэглы.

Яшчэ горшая справа з будаўніцтвам Пухавіцкага ільназаводу, дзе будаўніцтва выканана на 3 проц. Не хапае 100 кбм. пілёнага лесаматар'ялу і 47 кбм. круглага лесу.

Галоўнымі прычынамі, якія зрываюць пабудову ільназаводаў у тэрмін, зьяўляюцца наступныя: будвучастак, маючы амаль усе неабходныя матар'ялы, да гэта часу не заключыў з калгасамі дагавораў на рабочую сілу. Цяпер пачалася ўборачная кампанія, і калгасьнікі пачалі пакідаць пабудовы. Рабочай сілы, асабліва кваліфікаванай, заводы забясьпечаны толькі на 60 проц.

На пабудовах не разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, не скарыстана пачынаньне паасобных рабочых (Пухавічы, Рэчыца), якія абвясьцілі сябе ўдарнікамі, і не перанесена гэта пачынаньне на ўсе заводы. Прэміяльны фонд у суме 9.000 руб. зусім не скарыстоўваецца.

Вельмі дрэнна пастаўлена справа в забясьпячэньнем рабочых. На Халмянскім (Рэчыца), Крыўскім (Уваравічы) і Бабруйскім заводах не наладжана грамадзкае харчаваньне. Рабочыя крыўскага ільназаводу два месяцы не атрымлівалі прадуктаў харчаваньня.

З боку паасобных РК КП(б)Б і раённых устаноў назіраюцца апартуністычныя адносіны да будаўніцтва ільназаводаў. Пухавіцкі РК КП(б)Б і РВК нічым не дапамагаюць распачатаму будаўніцтву ільназаводу. Сакратар РК КП(б)Б проста заявіў: «ільняны завод нам не патрэбен, бо наш раён жывёлагадоўчы; бяз нас вырашылі будаваць завод, бяз нас няхай будуюць».

Брыгадзір «Зьвязды»:
М. Р. САКАЛОЎСКІ.

Ветрынскі ільназавод чакае матар'ялу

ВЕТРЫНА. Пабудова Ветрынскага ільназаводу зусім не забясьпечана матар'ялямі. На пабудову галоўнага корпусу патрэбны цьвікі, толь, сартовае жалезо 1 дошкі адпаведнай якасьці. Калі гэтыя матар'ялы не паступяць праз два дні, дык пабудова заводу да 1-га жніўня сарвецца.

Яшчэ адзін з будынкаў заводу скончан, і яго накрыць, патрэбна шчапа, якое да гэтага часу яшчэ няма.

Належныя арганізацыі павінны тэрмінова забясьпечыць пабудову дэфіцытнымі матар'ялямі.

Брыгада «Зьвязды»

Спынілі будаўніцтва

СУРАЖ. (Па тэлеграфу). З-за адсутнасьці цэмэнту і цьвікоў спыняецца будаўніцтва Сураскага ільназаводу.

Гафт Шуганаў.

***

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. (Па тэлеграфу). Будаўніцтва Хоцімскага ільназаводу сарвана. Адазваны тэхнік. Неабходна цьвікі, жалезо і тэхнік.

Брыгада «Зьвязды»:
САРУДНЭР І ТАНЬКО.

ІЛЬГОТЫ

па с.-г. падатку НОВЫМ КАЛГАСЬНІКАМ

ДАГЭТУЛЬ НЕКАТОРЫЯ РАЁНЫ НЕ ПРАДАСТАВІЛІ КАЛГАСЬНІКАМ ПА ІХ НЕАГРАМАДЖАНЫХ ДАХОДАХ УСТАНОЎЛЕНЫХ ЗАКОНАМ ІЛЬГОТ ПА С.-Г. ПАДАТКУ. АСАБЛІВАЕ ПАРУШЭНЬНЕ ЗАКОНУ НАГЛЯДАЕЦЦА Ў АДНОСІНАХ ТЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ, ЯКІЯ ЎСТУПІЛІ Ў КАЛГАСЫ Ў ЧАС АБО ПАСЬЛЯ ЎЛІКУ АБ'ЕКТАЎ АБКЛАДАНЬНЯ.

НАРКАМФІН БССР ТАВ. ХАЦКЕВІЧ КАТЭГАРЫЧНА ПРАПАНАВАЎ УСІМ РАЁННЫМ І ГАРАДЗКІМ ФІНАДДЗЕЛАМ НЕАДКЛАДНА ПРАДАСТАВІЦЬ НАСТУПНЫЯ ІЛЬГОТЫ ЎСІМ КАЛГАСЬНІКАМ, ЯКІЯ ЎСТУПІЛІ Ў КАЛГАСЫ Ў КАНЦЫ АБО ПАСЬЛЯ ЎЛІКУ АБ'ЕКТАЎ АБКЛАДАНЬНЯ, АГРАМАДЗІЎШЫ МАЕМАСЬЦЬ У ТАКОЙ МЕРЫ, ЯК ГЭТАГА ПАТРАБУЕ СТАТУТ С.-Г. АРЦЕЛЯЙ І ДЫРЭКТЫВЫ НКЗ І КАЛГАСЦЭНТРУ.

— ВЫКЛЮЧЫЦЬ З АБКЛАДАНЬНЯ ЎСЕ АГРАМАДЖАНЫЯ ДАХОДЫ; ВЫКЛЮЧЫЦЬ З АБКЛАДАНЬНЯ НЕАГРАМАДЖАНУЮ ЖЫВЁЛУ, А ТАКСАМА ДАХОДЫ АД ПРОДАЖУ ПРАДУКТАЎ НА ПРЫВАТНЫМ РЫНКУ ПА ПАВЫШАНЫХ ЦЭНАХ.

— ПРАДАСТАВІЦЬ ІЛЬГОТЫ ЗА ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ І ІНШЫХ АСОБ, ПЕРАЛІЧАНЫХ У АРТ. 62 ПАЛАЖЭНЬНЯ АБ С.-Г. ПАДАТКУ.

— ПРАДАСТАВІЦЬ ІЛЬГОТЫ ЗА ПАСЕВЫ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ.

— ЦАЛКАМ ВЫЗВАЛІЦЬ АД АБКЛАДАНЬНЯ НЕАГРАМАДЖАНЫЯ ДАХОДЫ ТЫХ ГАСПАДАРАК КАЛГАСЬНІКАЎ, ДЗЕ АДЗІН АБО НЕКАЛЬКІ ЧЛЕНАЎ СЯМ'І ЗАКАНТРАКТАВАЛІСЯ ДЛЯ РАБОТЫ Ў ДЗЯРЖАЎНЫХ І КААНЭРАЦЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ.

— НА НЕАГРАМАДЖАНЫЯ ДАХОДЫ КАЛГАСЬНІКАЎ НАЛІЧЫЦЬ ПАДАТАК ПА ПАНІЖАНАЙ ШКАЛЕ СТАВАК.

ГЭТАКІЯ-Ж ІЛЬГОТЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ БЕЗАДКЛАДНА ПРАДАСТАЎЛЕНЫ ЎСІМ КАЛГАСЬНІКАМ, ЯКІЯ ЎСТУПЯЦЬ У КАЛГАСЫ ПА ЎБОРКІ ЎРАДЖАЮ.

Яшчэ больш узмацніць барацьбу НА ДВА ФРАНТЫ

Бязьлітасна змагаючыся супроць правага апартунізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе, рашуча выкрываць і перамагаць „лявацкія“ заскокі і прымірэнцтва да ўхілаў

УЛІЧЫЦЬ УРОКІ

Матар'ялы, якія сёньня зьмяшчаюцца ў нашай газэце, сыгналізуюць аб фактах прытупленьня балышавіцкай пільнасьці ў рабоце паасобных парт'ячэек і раёных арганізацый (Чырвонапольле, Лельчыцы), аб аслабленьні ўвагі да барацьбы на два фронты.

У Чырвонапольскай раённай партарганізацыі рад камуністаў, зьвязаных з сельскай гаспадаркай, яшчэ да гэтага часу знаходзяцца па-за калгасамі. Зразумела, які ўплыў могуць мець такія «камуністы» на вакольнае бядняцка-серадняцкае сялянства ў справе калектывізацыі, трымаючыся за свае аднаасобныя гаспадаркі, не жадаючыя аб'яднаць іх у калгас.

Характэрна, што кіраўніцтва раённай партарганізацыі ня толькі не паставіла рашуча пытаньня аб прабываньні ў партыі іх за адмаўленьне ўступаць у калгас, а трымае гэтых яўных апартуністаў практыкі на кіруючай рабоце; некаторыя з іх нават да гэтага часу зьяўляюцца сакратарамі парт'ячэек.

У апраўданьне сваёй апартуністычнай практыкі ёсьць спробы адкрыта прапагандаваць кулацкую ідэалёгію. Сакратар ячэйкі Камароў адкрыта выказваецца за спыненьне калектывізацыі да восені. Бяранскі (таксама сакратар ячэйкі), апынуўшыся пад уплывам клясава-варожых элемэнтаў, выступае ва ўгоду кулаку супроць зьдзельшчыны ў калгасах.

Гэта апартуністычная практыка і «тэорыя» пры ўмовах прымірэнчых адносін з боку Чырвонапольскага РК зьявілася асноўным тормазам калгаснага руху, асноўнай прычынай буйнейшых прарываў у выкананьні чарговых задач партыі на вёсны.

У радзе ячэек Лельчыцкай раённай партарганізацыі праваапартуністычная практыка перапляталася з «лявацкімі» перагібамі. Адміністраваньне калгасным рухам, антысераднякія перагібы, адсутнасьць масавай работы сярод беднаты і сераднякога сялянства штурхнулі частку сераднякоў пад уплыў кулака. Раённае партКіраўніцтва, страціўшы бальшавіцкую пільнасьць, аказалася нездольным забясьпечыць выразнае выкананьне задач партыі, не мабілізавала арганізацыі на бязьлітасную барацьбу з кулацкай агентурай — правым апартунізмам і «левымі» загібшчыкамі, якія, як і прыя, сваімі дзеяньнямі ўзмацнялі пазыцыі клясавага ворага — кулака. Такое становішча прывяло да ганебнага адставаньня раёну ў выкананьні раду важнейшых задач, зьвязаных з сацыялістычнай рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі.

З гэтых фактаў кожная партарганізацыя павінна зрабіць пэўны вывад, што бяз самай бязьлітаснай барацьбы на два франты, без барацьбы супроць правага апартунізму — галоўнай небясьпекі на даным этапе, «лявацкіх» заскокаў і прымірэнцтва да ўхілаў немыслімa пасьпяхова ажыцьцяўляць задачы сацыялістычнага будаўніцтва. Ні на мінуту не аслабляць барацьбы, а ўзмацняць яе, ня спыняючыся перад выключэньнем з партыі яўнага кулацкіх агента, не папраўных апартуністаў— такая задача кожнай ячэйкі КП(б)Б. Бальшавіцкая самакрытыка павінна зьяўляцца штодзённым мэтадам у рабоце ўсіх звеньняў партарганізацыі, мэтадам барацьбы з апартуністычным скажэньнем лініі партыі і ўсякімі перашкодамі, якія стаяць на шляху пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва.

Чырвонапольскі райком не змагаецца з апартунізмам

Чырвонапольскі раён калектывізаваны на 10-е ліпеня на 38,7 проц. Гэтых посьпехаў раённая арганізацыя дабілася ўпартай барацьбы за генэральную лінію партыі, барацьбой з кулацтвам і яго агентурай—правымі апартуністамі і «левымі» перагібамі.

Аднак, калі наглядзець, як ідзе калектывізацыя на паасобных сельсаветах, дык тут мы ўбачым вялікі разрыў. У той час, як Гораўскі, Бярэзінскі, Кабуцкі, Палужскі і Гарэзінскі сельсаветы ідуць уперадзе і процант калектывізацыі ў іх дасягае ад 50 да 85, Сабалеўскі, Выдрынскі, Міхніцкі, Клясінскі сельсаветы генабка плятуцца ў хвасьце і дасягнулі толькі ад 9 да 14 проц. калектывізацыі.

Чым-жа тлумачыцца такое ганебнае адставаньне? Галоўным чынам тым, што партыйныя ячэйкі гэтых сельсаветаў бязьдзейнічаюць. У іх рабоце пануе стаўка на самацёк. Яны не вядуць работы сярод беднаты і не даюць адпору кулацтву. Ужываньне зусім апраўдаўшага сябе мэтаду ў арганізацыі прыліву ў калгасы іх не датычыць. Ініцыятыўныя групы па вёсках, камісіі садзейнасьці справе калектывізацыі пры калгасах ў гэтых сельсаветах ня створаны, і работы ў гэтым напрамку ніякай не праводзілася, і не праводзіцца.

Сабалеўская, Выдрынская, Міхніцкая і Клясінская ячэйкі КП(б)Б ня сталі на чале калгаснага руху—канстатуе апошні пленум РК КП(б)Б. Весь асноўны прычыны адставаньня і ганебных тэмпаў у справе калектывізацыі гэтых сельсаветаў.

Правая практыка мае месца ў рабоце камуністаў-кіраўнікоў паасобных ячэек КП(б)Б: сакратар ячэйкі Камароў дае ўстаноўкі «пачакаць да восені з калектывізацыяй». Гэты кулацкі агент у радах партыі, калі на пленуме РК паставілі перад ім пытаньне рубам аб уступленьні ў калгас, заявіў літаральна наступнае: «Ад мяне патрабуюць пенажлівага». Як ня дзіўна, але гэты гора-камуніст Камароў яшчэ і сёньня знаходзіцца на кіруючай партрабоце сакратара ячэйкі КП(б)Б.

Сакратар ячэйкі (ён-жа і старшыня калгасу «КІМ») Барыскін цесна зьвязан з кулацтвам. Маючы сваякоўскія сувязі з клясава-варожымі элемэнтамі, Барыскін узяў да сябе на выхаваньне дзяцей попа, высланага за межы БССР. Ня дзіва, што гэты кулацкі прыхільнік Барыскін хіліць пенатрабным пераход калгасу на зьдзельшчыну нібы з тэй прычыны, што ў калгасе коні слабенькія, усе калгасьнікі работнікі роўныя і г. д.

У раёне ёсьць больш дзесяці камуністаў, зьвязаных з сельскай гаспадаркай і да гэтага часу не ўступіўшых у калгасы. Вось іх прозьвішчы: Міцікаў (сакратар Сабалеўскай ячэйкі), Дабравольскі—заг. пошты), Юруін (сакратар РВК), Рыцікаў (Райснаб, Ерафейка (старшыня Клясінскага сельсавету), Камароў (сакратар Гарадзецкай ячэйкі), Барэйка (сакратар Нова-Яльнянскай ячэйкі), Мельнікаў, Рыжыкаў і інш.

Трэба адзначыць, што РК КП(б)Б не зусім рашуча вёў барацьбу з правымі правага апартунізму з боку паасобных ячэек і асабліва сакратароў ячэек КП(б)Б, якія фактычна зрывалі справу калектывізацыі.

Трэба гэту памылку безадкладна выправіць і самым рашучым чынам ударыць па кулацкіх агентах, якія пралезлі ў партыю,—ім ня месца ў радах КП(б)Б.

П. Снавінскі.

Кіраўніцтва Лельчыцкага раёну зьнята з работы

„Калгасьнік на варце“ змазвае барацьбу на два фронты

Кіраўніцтва Лельчыцкай раённай парт арганізацыяй аказалася нездольным ажыцьцяўляць задачы партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Брыгада ЦК і ЦКК КП(б)Б, якая працавала ў гэтым раёне па праверцы работы партарганізацыі, выкрыла рад абурачых фактаў апартуністычнага скажэньня лініі партыі. Райком нявыразна арыентаваў арганізацыю ў пытаньнях чарговых задач партыі, не мабілізаваў партыйных мас на бязьлітасную барацьбу з правым апартунізмам і яго саюзьнікамі «левымі» загібшчыкамі. У рабоце па выкананьні галоўнейшых задач партыі элемэнты праваапартуністычнай практыкі перапляталіся з «левымі» загібамі. Індывідуальныя заданьні па загатоўках праводзіліся без папярэдняй работы сярод беднаты і калгасьнікаў. У радзе выпадкаў цьвёрдыя заданьні даводзіліся да сераднякаа-маломоцных гаспадарак. У рабоце па калектывізацыі дапушчаліся мэтады прымушэньчыны, адміністраваньне, мэтады прымусовасьці, наскрозь варожыя ленінскім прынцыпам добраахвотнасьці калгаснага руху.

Раённае кіраўніцтва аказалася нездольным мабілізаваць арганізацыю на бязьлітасную барацьбу з гэтымі недапушчальнымі скажэньнямі лініі партыі. У рэзультаце ўсяго гэтага частка сераднякоў і нават беднякоў аказалася пад уплывам кулацтва. У выкананьні раду бягучых гаспадарча-палітычных кампаній у гэтым раёне стварыліся глыбокія прарывы.

За дапушчаньне права-«лявацкага» скажэньня лініі партыі пленумам РК і райКК зьняты з работы сакратар РК Іваноў і сакратар райКК Барэйка. Таксама зьняты з работы старшыня РВК Данец і загадчык Земаддзелу Ляхавец.

Раённая газэта «Калгасьнік на варце» не пралыла сваёй ролі ў барацьбе за генэральную лінію партыі, нераўнача выкрывала факты праваапартуністычнай практыкі і антысераднякіх перагібаў. Нават зараз пасьля выкрыцьця злачыннага скажэньня партыйнай лініі ў раёне «Калгасьнік на варце», падаючы перадавы артыкул (№ 15 ад 19-га ліпеня) да вынікаў пленуму ЦК УсеКП(б) і бяручы ў аснову задачы ўборачнай кампаніі, ні словам не ўпамінае аб задачах раённай партарганізацыі па ліквідацыі апартуністычных памылак мінулага кіраўніцтва, аб задачах барацьбы на два фронты. Такое зьявішча нельга інакш разглядаць, як прымірэнцтва да апартунізму, змазваньне задач барацьбы з правым апартунізмам, галоўнай небясьпекай на даным этапе і «левакамі».

Пытаньне аб кіраўніцтве раённай газэтай і яе лініяй трэба неадкладна разглядзець.

Д.

Больш бальшавіцкай пільнасьці

Ня гледзячы на тое, што ва ўмовах Рагачоўскага раёну пастанова партыі і ўраду аб калектывізацыі БССР за час ваеннай сяўбы ня менш 30 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак магла быць ня толькі выканана, але і перавыкана, гэтага незабясьпечыла сваёй работай раённая партарганізацыя. У раёне ўцягнута ў калгасы толькі 25 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак. Такое адставаньне ў справе калектывізацыі тлумачыцца тым, што ў значнай частцы ячэек раёну праводзілася яўная праваапартуністычная стаўка на самацёк. У многіх ячэйках адсутнічала сыстэматычная растлумачальная работа сярод аднаасобнікаў. Пастановы VI Усесаюзнага зьезду саветаў і закон аб сельскагаспадарчым падатку на 1931 год не працавалы. Работа з беднатой—у поўным заняпадзе.

У выніку такой злачыннай бязьдзейнасьці раду парт'ячэек у сельсаветах (Крушынаўскі, Лучынскі, Станькоўскі, Старасельскі) процант калектывізацыі не перавышае 10. У тых-жа сельсаветах, дзе па-ўдарнаму ячэйкі перабудавалі сваю работу, дзе яны вдолелі мабілізаваць калгасныя масы на выкананьне адказьнейшых задач другой бальшавіцкай вясны, шляхам укараненьня зьдзельшчыны ў працы калгасаў, дзе настойліва і сыстэматычна праводзілася сярод аднаасобнікаў растлумачальная работа ў справе сацыялістычнай перабудовы вёскі, — дасягнуты значныя посьпехі. У гэтых перадавых сельсаветах толькі за першую палову чэрвеня арганізавана 28 новых калгасаў з 516 бядняцка-сераднякіх гаспадарак. Побач з гэтым, у старыя калгасы ўступіла каля 200 гаспадарак.

Рад сельсаветаў (М. Стралкеўскі, Сьсержанскі, Мярнулавіцкі) значна нераўмысліл сярэдні процант калектывізацыі па Беларусі. Кісьцянеўскі сельсавет наближаецца да суцэльнай калектывізацыі: у ім сацыялістычным сэктарам ахоплена 86 проц. гаспадарак.

Гэтыя дасягненьні яшчэ раз падкрэсьліваюць тое, што адставаньне некаторых сельсаветаў і нават раёну — вынік не налічэньні няспрыяючых «аб'ектыўных прычын», а апартуністычнай бязьдзейнасьці паасобных «кіраўнікоў» і некаторых партыйных ячэек у справе калектывізацыі.

Нядаўна, за яўна праваапартуністычнае выступленьне: «Мы ня зможам весьці барацьбу з кулаком, бо ў нашай ячэйцы толькі 7 чалавек», выступленьне, якое бязумоўна адбівае праваапартуністычную практыку ячэйкі, зьнят з работы сакратар Старасельскай ячэйкі Шчарбінскі.

Рагачоўская партарганізацыя на чале з райкомам павінны ўзмацніць сваю партыйную пільнасьць і ў усёй бальшавіцкай рашучасьцю ўдарыць па нішчыках і малаверах, якія перашкаджаюць выкананьню адказьнейшых задачаў на фронце сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Л. САЛАДУХІН.

ПЛЕНУМ ЦКК КП(б)Б

25 ЛІПЕНЯ ПЛЕНУМ ЦКК КП(б)Б ЗАСЛУХАЎ ДАКЛАД ТАВ. ПАЛЮДАВА І СУДАКЛАД НАМЕСЬНІКА НАРКОМА ЦКК-РСІ ТАВ. ІВАНОВА АБ СТАНОВІШЧЫ І ПЭРСПЕКТЫВАХ ДАЛЕЙШАГА РАЗЬВІЦЬЦЯ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ БССР І ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК.

ТАВ. ПАЛЮДАЎ У СВАІМ ДАКЛАДЗЕ СПЫНІЎСЯ НА ГАЛОЎНЫХ МОМАНТАХ РАБОТЫ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ І ЯГО РЭКАНСТРУКЦЫІ Ў РАЗРЭЗЕ ВЫКАНАНЬНЯ ДЫРЭКТЫЎ ЧЭРВЕНЬСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК УсеКП(б).

ТАВ. ІВАНОЎ У СВАІМ СУДАКЛАДЗЕ ПАДКРЭСЬЛІЎ, ШТО ЧЫГУНКІ БССР ЗУСІМ НЕВЫСТАРЧАЛЬНА РЫХТУЮЦЦА ДА АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК.

ПА ДАКЛАДАХ Т. Т. ПАЛЮДАВА І ІВАНОВА РАЗГАРНУЛІСЯ ШЫРОКІЯ СПРЭЧКІ.

Самацёк—зьлейшы вораг НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

ВЯРБОЎКУ У С.-Г. НАВУЧАЛЬНЫЯ УСТАНОВЫ, РАМОНТ І ШКОЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТ У ПАРАДАК ДНЯ ПАРТЫЙНЫХ ЯЧЭЕК

Арганізаванай вярбоўкай зьнішчым самацёк

Барацьба за кадры — важнейшая задача дня.

Гэта з усёй сілай падкрэсьлівалася ні адзін раз у пастановах партыі і ўраду, аб гэтым шмат пісалася ў друку.

Цяжка зараз знайсьці чалавека, які-б ня меў прадстаўленьня аб значэньні праблемы кадраў для сацыялістычнага будаўніцтва.

Ні адзін з кіраўнікоў гаспадарчых, прафэсіўных і каапэрацыйных устаноў выступаў з гарачымі прамовамі наконт важнасьці праблемы кадраў. Аднак, мы вымушаны канстатаваць, што ПААСОБНЫЯ КІРАЎНІКІ ТОЛЬКІ ДЭКЛЯМУЮЦЬ ПАСТАНОВЫ ПАРТЫІ. За гэтымі дэклямацыямі нярэдка хаваецца апартуністычная раўнадушша і простая бязьдзейнасьць у выкананьні важнейшай дырэктывы партыі.

Гэта асабліва ярка вырысоўваецца, калі прааналізаваць становішча з падрыхтоўкай кадраў і навучальнага году па лініі с.-г. навучальных устаноў, уключаючы і ВНУ. Нам не хапае вялікай колькасьці аграномаў, жывёлаводаў, торфаразпрацоўшчыкаў, тэхнікаў па асобных галінах с.-г. вытворчасьці, трактарыстаў і інш. Іх павінны даць нашыя с.-г. навучальныя ўстановы. Між тым, падрыхтоўка да навучальнага году па лініі гэтых устаноў у большасьці праходзіць самацёкам. Гэта ў першую чаргу адносіцца да такой важнай ВНУ, як Горацкая с.-г. акадэмія.

Бюракратычным распараджэньнем «для кіраўніцтва і выкананьня» аддзел кадраў НКЗБ ПАСТАВІЎ ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ НАБОР У С.-Г. АКАДЭМІЮ.

АНАЛЁГІЧНА «кіруюць» наборам у саўгасвучы, тэхнікумы ТРАКТАРАЦЭНТР І БЕЛСАЎГАСТРЭСТ. З мітар'ялаў нарады пры ЦК КП(б)Б відаць, што і ў справе падрыхтоўкі кадраў для ўборачна-загатоўчай кампаніі таксам ПАНУЕ САМАЦЁК.

Самацёк—гэты зьлейшы вораг навучальнага году—павінен быць ДАШЧЭНТУ РАЗЬБІТЫ МЕРАПРЫЕМСТВАМІ АРГАНІЗАВАНАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ НАБОРУ. Цэлы рад мерапрыемстваў у гэтым напрамку патрэбна разгарнуць зараз-жа.

Факультэты акадэміі, тэхнікумы, саўгасвучы павінны быць да пачатку навучаньня ПОЎНАСЬЦЮ ўкамплектаваны.

Асаблівая ўвага павінна быць аддана САЦЫЯЛЬНАМУ падбору. Пара дабіцца такога становішча, каб раённыя арганізацыі не займаліся толькі фармальнай выдачай дакумантаў адпраўляючым на навучобу. Трэба, каб людзі палітычна разумелі КАМУ яны даюць права ў будучым насіць імя савецкага спэцыяліста.

У справе самой арганізацыі вярбоўкі вялікую работу могуць і павінны правесьці калсцовыя КАМСАМОЛЬСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ. Камсамол у гэтым напрамку ўзяў на сябе цэлы рад абавязкаў. ЁН ПАВІНЕН ІХ ВЫКАНАЦЬ.

Разам з тым вялікім тормазам ня ва ўкамплектаваньні, так і ў свалчасовым пачатку навучаньня зьяўляецца зацяжка будаўніцтва і рамонту.

Партыйныя камітэты, ячэйкі як у раёне, так і ў адпаведных гаспадарчых, каапэрацыйных і іншых установах пытаньні вярбоўкі будаўніцтва, рамонту павінны БЕЗАДКЛАДНА паставіць на парадак дня.

Неабходна моцна ўдарыць па КАНКРЭТНЫХ аматарах самацёку.

Даць кадры для прыёму новага ўраджаю

(Па матар'ялах нарады пры аддзеле кадраў ЦК КП(б)Б)

Падрыхтавацца на-бальшавіцку да ўборачна-загатоўчай кампаніі—баявая і неадкладная задача як гарадзкіх, так і ў асаблівасьці вясковых партыйных і гаспадарчых арганізацый.

Пры падрыхтоўцы да загатоўчай кампаніі асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на падрыхтоўку клясава-вытрыманых і высока-кваліфікаваных кадраў прыёмчыкаў, загадчыкаў пунктаў, весаўшчыкоў і г. д.

Посьпехі ўборачнай і загатоўчай кампаніі ў гэтым годзе будуць зьлежаць у вялікай меры ад працаздольнасьці і гібкасьці ўборачнага і загатоўчага апаратаў.

У гэтым годзе для загатоўчай кампаніі павінны быць падрыхтаваны праз каротка-тэрміновыя курсы-нарады ня менш як 8.700 чалавек. Такая-ж колькасьць неабходна і па лініі ўборачнай кампаніі.

Белкаапсаюз павінен падрыхтаваць да загатоўчай кампаніі прыёмчыкаў, кіраўнікоў пунктаў і інш.—3.200 чалавек. Хлебажывёлаводсаюз—3.875 чал. Бліпынасаюз—750 чал. і г. д.

Аднак на сёньня сетка кароткатэрміновых курсаў у большасьці яшчэ не разгорнута. Яна існуе толькі ў ведамсьцьвенных плянах адпаведных устаноў. Нават там, дзе курсы ўжо прыступілі да працы, яны поўнасьцю не ўкамплектаваны.

Пытаньне падрыхтоўкі клясава-вытрыманых кадраў да ўборачнай і загатоўчай кампаніі яшчэ ня стала ў цэнтры ўвагі партыйных і гаспадарчых арганізацый на мясцох. Больш таго, нават некаторыя РК КП(б)Б ня выканалі пастанову Сакратарыяту ЦК КП(б)Б, якая забараніла перакідваць работнікаў загатоўчага апарату на іншую работу. Работнікі загатоўчага апарату злачынна «разбэзгарываюцца», РК КП(б)Б перакідваюць іх на другую работу.

Аддзел кадраў ЦК КП(б)Б вылучыў дзьве ўдарныя брыгады, якім даручана ў трохдзённы тэрмін зрабіць генэральную праверку, як ідзе падрыхтоўка кадраў да прыёму новага ўраджаю, выявіць канкрэтных вінаватых, якія зрываюць разгортваньне сеткі каротка-тэрміновых курсаў, укамплектаваньне іх клясава-вытрыманымі работнікамі.

Белкаапсаюзу, Хлебажывёлаводсаюзу, партыйным і гаспадарчым арганізацыям на мясцох патрэбна зараз-жа разгарнуць баявымі ўдарнымі тэмпамі падрыхтоўку кадраў да сустрэчы патоку новага ўраджаю.

Знге.

Пара зьнішчыць блытаніну

Некалькі слоў аб тэй установуцы, якая павінна быць у падрыхтоўцы кадраў для сацыялістычнае сельскае гаспадарцы ў Горацкай акадэміі.

Па-першае, неабходна удасканаліць профіль спэцыяліста кожнага факультэту. МЫ МАЕМ ПОЎНУЮ БЛЫТАНІНУ. Напрыклад, на расьлінфаку былы дэкан Мяцельскі Т. на сходзе трэцяга курсу казаў, што мы павінны выпускаць спэцыяліста-арганізатара пэўнай галіны сельскае гаспадаркі. У такім напрамку студэнты і разглядалі навучальны плян.

Між тым, дырэктар акадэміі, пры заці вярджэньні навучальных плянаў упэўнены, што паміж арганізатарам галіны і арганізатарам гаспадаркі наогул розьніцы няма. Пры такой блытаніне саміх кіраўнікоў немагчыма падрыхтаваць належных спэцыялістаў для паасобных галін, сельскай гаспадаркі.

Па-другое, расьлінфак павінен даць спэцыяліста буйной мэханізаванай сацыялістычнай гаспадаркі. У сапраўднасьці мы маем у навучальных плянах удзельную вагу мэханіка-тэхнічных дысцыплін—6,7 проц., у той час, як хэмічныя дысцыпліны займаюць 20,3 проц., біялёгічныя—28,9 проц. Дзе спэцыяліст буйной мэханізаванай гаспадаркі? Расьлінфак дае агранома-дасьледчыка, а не агранома вытворчасьці. Такім чынам, навучальныя пляны не перабудаваны ў напрамку запатрабаваньняў сацыялістычнае рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

Факультэт мэханізацыі сельскае гаспадаркі дае спэцыялістаў мэханіка-энэргетычнае базы, унутры гаспадарчага транспарту, агульных працэсаў вытворчасьці. А хто павінен ведаць мэханізацыю спэцыяльных працэсаў вытворчасьці? Ведаць інжынэру-мэханізатару спэцыяльныя працэсы вытворчасьці па кожнай галіне немагчыма, а тэму ён ня можа быць і мэханізатарам гэтых працэсаў, арганізоўваць на мэхфаку аддзяленьне па ліну ўсіх аддзяленьняў пэўных галін нямэтазгодна. Адсюль вывад адзін: мэханізатарам спэцыяльных працэсаў вытворчасьці пэўнай галіны павінен быць аграном (побач з іншымі абавязкамі), як гэта даўно робіцца ў падрыхтоўцы спэцыялістаў прамысловасьці.

Трэба павялічыць удзельную вагу мэханіка-тэхнічных дысцыплін (без павялічэньня тэрміну скончэньня ВНУ, які зараз існуе) у навучальных плянах расьлінфаку і, наогул, пераглядзець навучальныя пляны ў бок прыстасаваньня да сацыялістычнага напрамку разьвіцьця нашае сельскае гаспадаркі.

Студэнт.

Завочнае навучаньне недаацэньваецца

Ня гледзячы на вялікія запатрэбаньні народнай гаспадаркі на вучаных спэцыялістаў, падрыхтоўка кадраў праз сыстэму завочнага навучаньня да гэтага часу недаацэньваецца. Калі прагледзець становішча ў галіне на Наркамземе, Белкаапсаюзе, Асьветы, дык гэта недаацэньванае.

Наркамзем у мінулым годзе атрымаў ад НК Асьветы калгасны ўніверсытэт з кантынгентам 830 чал. завочнікаў, ты ўнівэрсытэт Наркамзем перарганізаваць у філіял завочных курсаў пры Калгаспэнтры СССР з кантынгентам у 3.800 асоб. Да правядзеньня гэтай рэарганізацыі, слухачы былі разьмешчаны, але рэарганізацыя і яе абмеркаваньне не праведзена. Тое-ж самае і з філіялі НК Асьветы. Па завочным навучаньню плянам на 1930-31 г. вызначана прыняць 650 асоб завочнікаў, фактычна прынята 500; па завочным навучаньню замест вызначаных 500 — 406, па рабфаку—замест 400 — 431.

Па Белкаапсаюзе, якому было вызначана па ўсіх відах завочнага навучаньня 165 асоб, на сёньня заняты Маскоўскі Інстытут тэхнікумаў, абмен і мукі вызначыў Белкаапсаюзу 50 асоб, а запоўнены толькі два.

Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што справа падрыхтоўкі кадраў праз сыстэму завочнага навучаньня знаходзіцца ў дрэнным становішчы. Разам з тым сыстэма завочнага навучаньня зусім ня на забясьпечана матэрыяльнымі крэдытамі. Разам з боку НК Асьветы, адсутнічае кантроль за выразнасьцю работы завочных навучальных устаноў.

З мэтай карэннага паляпшэньня работы на гэтым вучастку неабходна сыстэму завочнага навучаньня рэарганізаваць паводле галіннага прынцыпу стацыянарных навучальных устаноў.

Для паляпшэньня мэтадычнага кіраўніцтва завочнымі навучальнымі ўстановамі неабходна ўвесьці ў склад НК Асьветы представіцеляў усіх ведамстваў—гаспадарчых, кааперацыйных і іншых арганізацыяў, якія маюць як стацыянарныя, так і завочныя навучальныя ўстановы. У практыку работы гэтых устаноў патрэбна ўвесьці мерапрыемствы, якія забясьпечылі б урокі абмен вопытам.

МАЦІЯС.

Набор у с.-г. ВНУ трэба арганізаваць

Для прамысловасьці і сельскай гаспадаркі патрэбен такі спэцыяліст, якога можна даверыць той ці іншы кіраўніцкі гаспадарчы пост. Адсюль вынікае неабходнасьць сур'ёзнага падыходу да сацыяльнага падбору студэнтаў арганізацыі ВНУ.

Як-жа гэта справа пастаўлена ў нашых с.-г. ВНУ? Саюзны Наркамзем у дырэктыву аб тым, што кантынгент студэнтаў у гэтыя ВНУ павінен складацца з наступных сацыяльных груп: ня менш 30 проц. індустрыяльных рабочых і іх дзяцей, у тым ліку ня менш 15 проц. с.-г. рабочых і батракоў, ня менш 50 проц. сялян-калгаснікаў, большасьцю 1 сераднякоў. Гэтую дырэктыву аддзел кадраў НКЗБ накіраваў усім с.-г. ВНУ «для кіраўніцтва і выкананьня». Відавочна, што аддзел кадраў НКЗБ мяркуе махам бюракратычным пяра бяз усякіх арганізацыйных мерапрыемстваў выканаць дырэктыву саюзнага Наркамзему. Выходзіць, што трэба чакаць пакуль людзі стройнымі радамі, падзяліўшыся на сацыяльныя зьвеньні, самацёкам прыдуць у ВНУ.

Ясна, што пры такім кіраўніцтве набор у акадэмію пастаўлен над пагрозу зрыву. Аддзелу кадраў НКЗБ трэба неадкладна дабіцца, каб аддзеленьня органы катэгарычна прапанавалі раённым арганізацыям распачаць арганізаваную вярбоўку людзей для паслежкі у с.-г. ВНУ. Разам з гэтым набходна дабіцца плянавага перараз'мерканьня ўсіх выпускнікоў рабфаку з тым, каб неабходны мінімум рабфакаўцаў быў накіраван у с.-г. ВНУ. Гэта важна падкрэсьліць таму, што цэлы рад інстытутаў ня мае ніводнага прымацаванага рабфакаўца.

Кампаніі па вярбоўцы ў с.-г. ВНУ, трэба надаць масава-палітычны характар. Пры актыўным удзеле савецкіх, прафэсыянальных, камсамольскіх арганізацый і ўсёй грамадзкасьці мы зможам адвесьці пагрозу зрыву вучэбнага году ў с.-г. ВНУ.

Буткевіч.

ТРАШЧАЦЬ ПАДВАЛІНЫ КАПІТАЛІЗМУ

Капіталістычны сьвет у паніцы. Заталіся падваліны, ніжні паверх капіталістычнага будынку — Нямеччына загружаецца ў хвалі фінансавай катастрофы.

А яшчэ год таму назад, калі капіталістычны сьвет усё-ж бязупынна паружаўся ў бездань крызісу, многія буржуазныя эканамісты, а таксама падголоскі і агенты капіталізму — сацыял-інтэрвэнцыяністы з мінаю знатакоў і «спэцаў» заяўлялі, што сучасны крызіс — гэта не загніваньне, не разлажэньне ўсёй капіталістычнай сыстэмы, а звычайны крызіс, якіх шмат ведае гісторыя капіталізму. Сацыял-фашысты борацісты, асабліва з нямецкай сацыял-дэмакратыі, і польскія пэпэсэўцы з пенаю на губах стараліся давесьці перад працоўнымі масамі ўсю неабгрунтаванасьць аналізу крызісу даючу Камінтэрнам. У мэтах трыманьня працоўных мас у падхумаранстве капіталу, старалісь перакананць гэтыя масы ў лёгкасьці характары гэтага крызісу, непагрымасьці крызісу для Амэрыкі — гэтай цытадэлі капіталізму. Пушчана была ў ход уся буржуазная сацыял-фашыстская апаратура, абы толькі закрыць, замазаць перад працоўнымі ўсю глыбінасьць падзеяў, адцягнуць іх увагу ад сапраўднай прычыны крызісу, адцягнуць са шляху рэвалюцыйнай барацьбы. Больш таго, сацыял-фашысцкія трахтоты ў крызісе пачалі абвяшчаваць Савецкі Саюз, высьвятляючы прычыны крызісу, нібы савецкім «дэмпінгам», каб усю злобу і абурэньне галодных мас накіраваць супроць першай пралетарскай дзяржавы і падрыхтаваць такім чынам грамадзкую думку да ўзброенага нападу на СССР.

З кастрычніка 1929 г. і па сучасны момант гаспадарчы крызіс ва ўсім сьвеце бязупынна паглыбляецца. За гэты час капіталізм зрабіў значны крок наперад толькі ў адным напрамку — у наблізжэньні шпаркімі крокамі да катастрофы. Сёньня няма тэй капіталістычнай дзяржавы, якая-б ня была ахоплена крызісам, няма таго кутка на зямной кулі, дзе-б не адчуваўся развал капіталістычнай сыстэмы, за выключэньнем, зразумела, Савецкага Саюзу, дзе нябачанымі ў гісторыі чалавецтва тэмпамі будуецца сацыялізм, дзе ліквідавана беспрацоўе, дзе жыцьцё бурліць.

Так, у Амэрыцы, якая ў вачох буржуазіі ўсяго сьвету зьяўлялася ўзорам устойлівасьці і магутнасьці, у чэрвені бягучага году загрузка прамысловасьці, асабліва сталяліцейная і жалезаапрацоўчай наблізілася да ўзроўню 1921 г.

Аўтамабільная прадукцыя ў чэрвені складала 225 тыс. машын супроць 350 тысяч у чэрвені мінулага году і 567 тысяч у чэрвені 1929 г.

Прадукцыя сталі — 2.076 тыс. тон супроць 3.419 тыс. тон у чэрвені 1930 году і жалеза 1.639 тыс. тон супроць 2.934 тыс. тон у мінулым годзе.

Замежны гандаль зьнізіўся да ваеннага ўзроўню. Агульная сума экспарту ў чэрвені складала 187 млн. долярaў супроць 298 млн. долярaў у чэрвені 1930 г. і 393 млн. долярaў у чэрвені 1929 г., імпарт-жа — 176 млн. долярaў супроць 205 млн. долярaў у чэрвені 1930 г. і 353 млн. долярaў у 1929 г.

Цэны на пшаніцу ўпалі да самага ніжэйшага ўзроўню за апошнія 83 гады. Міністэрства земляробства прадракае, аднак, што прадстаіць «яшчэ адзін год вельмі нізкіх цэн».

Скарачэньне зарплаты рабочым на фэбрыках і заводах адбываецца бязупынна. Вядомы эканаміст Вэрыцьк лічыць, што зарплата, якая выдаецца прамысловымі прадпрыемствамі, вымешылася ў агульным на 39 проц. з 1929 г.

Паводле даных міністэрства працы, большасьць рабочых, занятых у прамысловасьці, у чэрвені скарацілася зноў на 2,6 проц. Агульная-ж сума зарплаты —на 6,2 проц. Індэкс занятасьці рабочай сілы складае за чэрвень 72,2 проц. супроць 85,5 проц. у чэрвені 1930 г. і 93,8 проц. у чэрвені 1929 г. Такі малюнак гаспадарчага развалу ў ПАЗШ.

Яшчэ больш сумны малюнак гаспадарчага крызісу наглядзецца ў іншых капіталістычных дзяржавах. Так, напрыклад, у Англіі за першыя 6 месяцаў бягучага году імпарт склаў 418 млн. фунтаў стэрлінгаў — на 124 млн. фунтаў стэрлінгаў менш, чым за той-жа перыяд мінулага году. Экспарт Англіі складаў 225 млн. — на 119 млн. менш, чым у мінулым годзе. Асабліва моцна ўпаў вываз жалеза, сталі, машын і базэўных вырабаў. Асабліва рэзка скарацілася ангельскі вываз у чэрвені бягучага году, дасягнуўшы 35 млн. фунтаў стэрлінгаў супроць 51 млн. у чэрвені мінулага году.

Нават Францыя, якая аграбіла Нямеччыну і якая да гэтага часу хваляберылася сваёй гаспадарчай устойлівасьцю, зараз тэмпамі ўступіла ў паласу эканамічнага крызісу і досыць востра яго адчувае. Так, за першае паўгодзьдзе 1931 г. імпарт ва Францыі склаў 23,2 млрд. франкаў, а экспарт — 16,2 млрд. У параўнаньні з тым-жа перыядам мінулага году імпарт скарацілся на 3,6 млрд. французскіх марак, экспарт на 6,4 млрд. марак. У першым паўгодзьдзі мінулага году пасыў гандлёвага балянсу дасягнуў 7 млрд. франкаў, тады, як за ўвесь 1930 г. ён склаў 9,3 млрд. Расьце бязупынна і армія беспрацоўных за Францыі.

Капіталістычны сьвет толькі за апошнія два гады крызісу панёс вялізарнейшыя страты. Вядомы буржуазны эканаміст В. Вайцінскі падлічае, што за 15 месяцаў крызісу — з кастрычніка 1929 г. па сьнежань 1930 г. прамысловая прадукцыя ў Нямеччыне пала на 11 млрд., у Англіі — 5 млрд., ПАЗШ — 32-33 млрд. марак.

Яшчэ большыя страты ў прадукцыі, паводле падлічэньняў таго-ж Вайцінскага, павін

РАЗГОРНУТЫМ ФРОНТАМ--У БОЙ ЗА ТОРФ!

ЗА СВАЯЧАСОВЫ ПУСК „518“

ПУСК МАГІЛЕЎСКАЙ ЦЁПЛАЭЛЕКТРАЦЭНТРАЛІ—

пад пагрозай

Патрабуем ад Энэргацэнтру забесьпячэньня будаўніцтва матар'яламі

МАГІЛЕЎ, 25. У Магілеве на Дняпры будуецца першая на Беларусі магутная цёплаэлектрацэнтраль. Станцыя запраектавана па апошнім слове тэхнікі са скарыстаньнем пары і гарачай вады, з вадзянымі і паветранымі экапоммайзэрамі, мэханічнымі топкамі і г. д. Агульны кошт цэнтралі—каля 4 млн. руб. 95 проц. абсталяваньня для станцыі закуплена за мяжою і частка яго пачала паступаць з кастрычніка мінулага году.

Тэрміны скончэньня будаўнічых работ ужо некалькі раз перанесены. Станцыя павінна быць пушчана паводле апошняга тэрміну ў лістападзе 1931 году. Аднак, пуск цэнтралі—пад пагрозай. Мантаж яе быў распачат рабочымі з вялікім энтузіязмам, але з-за недахвату агнятрывалай цэглы і шамотнай масы, а таксама арматурнага жалеза патрэбных разьмераў, тэмпы пачалі зьніжацца.

Між тым, мільённае імпартнае абсталяваньне ляжыць да гэтага часу на складах будаўніцтва пад часовымі навесамі і часткова пад адкрытым небам і яго нельга ўстанавіць з-за нескончэньня будаўніцтва.

Запяжка ў пуску цёплаэлектрацэнтралі пагражае рабоце магілеўскай фабрыкі штучнага валакна, мастаўёвага заводу, мылаваранага заводу, косьцапрацоўчага заводу і раду іншых прадпрыемстваў.

Энэргацэнтр павінен прыняць тэрміновыя меры да забесьпячэньня магілеўскай цёплаэлектрастанцыі матар'ялямі і ў першую чаргу накіраваць на будаўніцтва 25-30 вагонаў агнятрывалай цэглы, каб свячасовым пускам станцыі не амяртвляць мільёнаў рублёў, якія ўкладзены ў імпартнае абсталяваньне. А.

Адкрыць сэмафоры

ГРУЗАМ МАГНІТАГОРСКАГА БУДАЎНІЦТВА

МЕНСКІЯ ЧЫГУНАЧНІКІ Ў ВЫКАНАНЬНЕ ЎЗЯТЫХ НА СЯБЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ ПА НАЙХУТЧЭЙШЫМ І БЕСЬПЕРАБОЙНЫМ ПРАСОЎВАНЬНІ ГРУЗАЎ МАГНІТАГОРСКАГА БУДАЎНІЦТВА ВЫСЛАЛІ НА СТ. НЕГАРЭЛАЕ І БАРЫСАЎ СВАІХ ПРАДСТАЎНІКОЎ.

ПРАДСТАЎНІКІ МЕНСКІХ ЧЫГУНАЧНІКАЎ ПАВІННЫ БУДУЦЬ ПРАВЕРЫЦЬ, ШТО КАНКРЭТНА РОБІЦЦА НА ГЭТЫХ ВУЧАСТКАХ ДЛЯ ПРЫЕМКІ І ДАЛЕЙШАЙ АДПРАЎКІ МАГНІТАГОРСКІХ МАРШРУТАЎ З АГНЯТРЫВАЛАЙ ЦЭГЛАЙ. НА СТ. НЕГАРЭЛАЕ ВЫЕХАЎ ТАВ. МАЙСАК, А НА СТ. БАРЫСАЎ—ТАВ. КУЗЬНЯЦОЎ. Г.

ПАПЕРУ—КРАІНЕ

ПЕРШЫЯ ПЕРАМОГІ

18 ліпеня	19 ліпеня	20 ліпеня	21 ліпеня	22 ліпеня
24	37	33	45	65,3

ПАЧАТАК ПЕРАЛОМУ

ДОБРУШ, 23 ЛІПЕНЯ.

22 ЛІПЕНЯ ФАБРЫКА ВЫПРАЦАВАЛА 65,3 ТОН ПАПЕРЫ. ТАКІМ ЧЫНАМ, НЕКАТОРЫ ЗРУХ У ВЫКАНАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНУ ЁСЬЦЬ. АЛЕ ЎСЁ ЯШЧЭ ВЫСОКІ ПРОЦАНТ БРАКУ. 22-ГА БЫЎ ПРАСТОЙ У 19 ГАДЗ. 15 ХВ. З-ЗА АДСУТНАСЬЦІ ЭНЭРГІІ, МАСЫ І НЯЎВАЖЛІВЫХ АДНОСІН ДА МАШЫН.

БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ», «ПАЛЕСКАЙ ПРАЎДЫ», ЧЫРВОНАЙ» БРАКАМОЛКІ» І МенАПП.

БРАК

ЗАТРЫМЛІВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ

Выпрацоўка паперы ўсё ячшэ хістаецца. 18 ліпеня было выпрацавана 24 тоны, 19 выпрацавалі 37 тон, 20—зьніжэньне да 33 тон, 21—павышэньне да 45 тон.

З прычыны недахвату энэргіі апошнія 2 дні не працавалі першая і шостая машыны. Але будзе няправільна, калі невыпрацоўку паперы тлумачыць выключна недахватам энэргіі.

Тыя машыны, якія працуюць, усё-ж не даюць поўнасьцю сваёй нормы.

Машына № 2 павінна даваць у суткі 12.600 кгр., а 19 ліпеня яна выпрацавала 8.063 кгр., 20-га—6.718 кгр.

Асноўная прычына—вялізарны брак, які даходзіць да 30 проц. выпрацоўкі.

У тэхнічным аддзеле склікаецца спэцыяльная нарада па высьвятленьні прычын такой колькасьці браку і там-жа будуць распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы па барацьбе з ім.

Выязная брыгада «Зьвязды» і Мен АПП'у: А. МАНЬКОЎ, З. АСТАПЕНКА, Ш. БРОЎКА І АН. ВОЛЬНЫ.

БЕЛТОРФ, БЕЛКАЛГАСЦЭНТР НАРКАМПРАЦЫ МАРУДНА РАЗГОРТВАЮЦЬ РЭАЛІЗАЦЫЮ ПАСТАНОВЫ ЦК КП(б)Б І СНК БССР АБ ТОРФАРАСПРАЦОЎКАХ

З дня апублікаваньня пастановы ЦК і СНК БССР аб торфараспрацоўках прайшло 6 дзён.

Як-жа рэалізуецца гэты вялізарнейшай важнасьці дакумант цэнтральнымі органамі, ад якіх у вялікай ступені залежыць хутчэйшая ліквідацыя прарыву, які ёсьць на тэрфяным фронце?

Праведзены брыгадай «Зьвязды» палёт на рад цэнтральных устаноў паказвае, што пастанова ў асноўным ня выканана, што людзі, якія непасрэдна адказваюць за выкананьне таго ці іншага пункту пастановы, не зразумелі ўсёй палітычнай важнасьці гэтай пастановы і безадказна з недапушчальнай павольнасьцю запягваюць выкананьне канкрэтных абавязкаў, якія пастаўлены ЦК КП(б)Б і СНК БССР перад кожнай у паасобку цэнтральнай установай.

Пяройдзем да фактаў.

Пункт 8-мы пастановы гаварыў: «Белторфу на працягу трох дзён ліквідаваць абязьлічку машын, паставіўшы па больш буйных распрацоўках (звыш 4 машын) начальнікаў агрэгатаў, якія кіравалі-б работай ня больш дзьвёх машын, адказвалі-б за пляны, за 100 проц. выкарыстаньне машын, за свячасовую сушку і ўборку торфу».

Белторф гэтага важнейшага пункту, ад якога залежыць больш пасьпяховае выкананьне плянаў торфаздабычы, ня выканаў, ня ўжыўшы рашучых захадаў да ажыцьцяўленьня пастановы.

Ня выкапан і адзін з асноўных пунктаў пастановы, дзе гаварылася аб тым, каб на працягу трох дзён перавесьці ўсе машыны па здабычы торфу на кругласутачную работу, замацаваўшы падоўжаны рабочы дзень.

Немагчымасьць выкананьня гэтага пункту кіраўнікі Белторфаб'яднаньня тлумачаць тым, што «няма рабочай сілы, няма сьвятла і галоўнае—гэта адсутнасьць тэхнічнага пэрсаналу».

Гаспадарчы разрахунак да машыны, цэху, і брыгады не даведзен. Па гэтым пункце Белторф толькі пачынае дагаворвацца з радам іншых устаноў.

Адносна пункту аб ліквідацыі прарыву па сушцы і ўборцы торфу прадстаўнік Белторфу гаворыць:

— Гэтага дасягнуць немагчыма. У нас няма рабочых рук, перашкаджаюць кліматычныя ўмовы.

Нічога не прадпрыняў Белторф і для выкананьня пункту 16-га, які ўскладае на апошні рад важнейшых абавязкаў.

Белторф абмежаваўся пасылкай на месцы асноўных торфараспрацовак 4 спэцыялістаў трэсту. Што імі зроблена на месцы—Белторф ня ведае.

ЦК ЛКСМБ і па сёпешні дзень ня выканаў свайго абавязацельства аб пасылцы на торфараспрацоўкі 1.000 камсамольцаў. Ніякіх вестак аб ходзе мабілізацыі ў ЦК няма.

Наркампрацы і Белкалгасцэнтр, выканаўшы абавязак аб пасылцы ў раёны адказных работнікаў для вярбоўкі рабсілы, ня ведаюць, што імі канкрэтна зроблена, колькі мабілізавана рабочых на торфараспрацоўкі. Белкалгасцэнтр павінен быў завербаваць 7 тыс. чал., а колькі завербавана—дакладных вестак няма.

Менскі, Віцебскі, Гомельскі і Аршанскі гарсаветы нічога не зрабілі для выкананьня пункту 14 аб пасылцы на торфараспрацоўкі рахункових работнікаў. Сваё заданьне выканаў толькі адзін **Магілеў.**

ЦСПСБ і Наркамасьветы, якія разам з партыйнымі, савецкімі і прафсаюзнымі арганізацыямі торфаздабываючых раёнаў павінны былі на працягу 3 дзён распрацаваць практычныя мерапрыемствы па рашучым паляпшэньні культурнага абслугоўваньня рабочых торфараспрацовак, абсалютна нічо... не зрабілі.

Наркамасьветы нават зусім ня чыталі гэтай пастановы і, калі адзін з брыгадзіраў запытаўся, што канкрэтна зроблена НКА па выкананьні 17 пункту пастановы, Нам. Наркома абсалютна нічога адказаць ня мог.

Прыклад бальшавіцкага выкананьня пункту пастановы аб мабілізацыі 700 рабочых з прадпрыемстваў на торфараспрацоўкі паказаў адзін ВСНГБ. 700 чалавек рабочых мабілізаваны і працуюць зараз на торфараспрацоўках.

Факты безадказных адносін да выкананьня пастановы ЦК і СНК радам цэнтральных устаноў прымушаюць нас біць трывогу.

Мы патрабуем рашучага ўмяшаньня ў гэту справу ЦКК—НК РСІ.

Пастанова ЦК і СНК БССР аб торфараспрацоўках павінна па-бальшавіцку праводзіцца ў жыцьцё.

Брыгада «Зьвязды»:
КРЫВІЦА, ЛЮЦЭРАВА, НАУМОВІЧ, ЛАПІЦКІ.

ТОРФАЗАВОД „БАЛЬШАВІК“ НА ШЛЯХУ ДА ПЕРАМОГІ

ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ ЗАВОДУ ПАВЯРНУЛАСЯ ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ

У выніку дрэннай расстаноўкі рабочай сілы, слабога разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, а таксама мэханізаванай здабычы торфу ЗАВОД «БАЛЬШАВІК» НЯ ВЫКОНВАЎ СВАЙГО ПРАМФІНПЛЯНУ.

Да 20-га ЧЭРВЕНЯ на торфараспрацоўках замест 4 працавалі 2 машыны, і толькі ў ЛІПЕНІ была пушчана трэцяя.

Віна ў гэтым у значнай ступені падае на мэханічны цэх, які перад пускам ня прывёў іх у належны парадак, не зрабіў патрэбнага рамонту.

Зараз мэханік спасылаецца на тое, што машыны і без рамонту будуць «працаваць і ня прыстануць».

РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІЯ ПРАПАНОВЫ РАБОЧЫХ АБ ПАЛЯПШЭНЬНІ РАБОТЫ НА ТОРФАЗАВОДЗЕ АДМІНІСТРАЦЫЯЙ МАРЫНУЮЦЦА БЯЗ УСЯКАГА РАЗГЛЯДУ.

Была ўнесена прапанова аб тым, што перасоўку машыны можна зрабіць ЗА 20-25 ХВІЛІН, але адміністрацыя ня супроць таго, каб на гэту справу ТРАЦІЛАСЯ ГАДЗІНА-ПАЎТАРЫ.

Толькі ў выніку шматлікіх сыгналаў цэнтральнага друку ЗАРАЗ ПРЫСТУПЛЕНА ДА ПЕРАБУДОВЫ ПАРТЫЙНАЙ І ГАСПАДАРЧАЙ РАБОТЫ Ў АДПАВЕДНАСЬЦІ З НОВЫМІ ЗАДАЧАМІ.

ПРАВОДЗІЦЦА КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ ЎДАРНУЮ БРЫГАДУ, ПАЧАЛІ СКЛІКАЦЦА ВЫТВОРЧЫЯ РАБОЧЫЯ НАРАДЫ, ЗРОБЛЕНА ЦЬВЁРДАЕ ПРЫМАЦАВАНЬНЕ РАБОЧЫХ ДА МАШЫН—ЛІКВІДАВАНА АБЯЗЬЛІЧКА, УВОДЗІЦЦА ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК У БРЫГАДАХ.

Брыгада «Зьвязды»: РЭЗЬНІКАЎ, МАЎЧАН, ШНУР

КІРАЎНІЦТВА ТОРФАЗАВОДУ імя ДАЎМАНА

НЯ ЗДОЛЬНА СТАЯЦЬ НА ЧАЛЕ ІНІЦЫЯТЫВЫ РАБОЧЫХ

Абязьлічка, ураўнілаўка, ігнараваньне гаспадарчага разрахунку—карэньні прарываў

Торфазавод імя Даўмана ўвесь час значна адстае па выкананьні свайго прамфінпляну, але ПАРТЫЙНАЯ ЯЧЭЙКА І ТАРФКОМ НЯ ЛІЧЫЛІ ПАТРЭБНЫМ ЗАЙМАЦЦА ГЭТЫМ ПЫТАНЬНЕМ.

Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ў заняпадзе. Ніякага кіраўніцтва ўдарнымі брыгадамі няма.

ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК НІ Ў АДНЫМ ЦЭХУ, АГРЭГАЦЕ І БРЫГАДЗЕ НЯ ЎВЕДЗЕН.

НЕ ЛІКВІДАВАНА АБЯЗЬЛІЧКА, у выніку чаго машыны стаяць па 6-8 гадз.

Пры складаньні торфу ў штабэлі не захоўваюцца ніякія тэхнічныя меры. Торф кладуць на сырым балоце бяз усякага подсьціпу, ад чаго 0,5 мэтра торфу псуецца ад асяданьня штабэляў і ідзе ў брак.

Апартуністычную хлусьню заводзкага трыкутніка аб слабасьці пёкамабіляў, адсутнасьці, рабочай сілы дашчэнту разьбівае КАМСАМОЛЬСКАЯ БРЫГАДА ТАРАНА, якая дае за зьмену 135 КУБАМЭТРАЎ замест вызначаных плянам 125.

КІРАЎНІЦТВА НЯ ІМКНЕЦЦА СТВАРЫЦЬ СПРЫЯЮЧЫХ УМОЎ ДЛЯ РАБОЧЫХ, НЯ ЗДОЛЬНА МАБІЛІЗАВАЦЬ РАБОЧУЮ МАСУ НА БАРАЦЬБУ ЗА ВЫСОКІЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ.

Прэміяваньне ўдарнікаў было праведзенна габінэтным парадкам. Рабочы ка пектыў аб гэтым нічога на ведае, невядома нават, хто атрымаў прэміі.

Паказу работы лепшых цэхаў, брыгад і паасобных ударнікаў ня было. Не вядзецца ніякай барацьбы і з прагульшчыкамі і гультаямі, якія ўсялякім чынам імкнуцца сарваць працоўную дысцыпліну.

Толькі пры дапамозе брыгады «ЗЬВЯЗДЫ» праца на заводзе ажыла. Былі пастаўлены дошкі, куды заносіліся канкрэтныя вінаватыя ў зрыве прамфінпляну. Абвешчан конкурс на лепшы цэх, агрэгат, брыгаду і лепшага ўдарніка.

Брыгадай выпушчаны 3 нумары насьценгазэты, у якіх усебакова паказаны прычыны ўсіх тых прарываў, якія маюць месца на заводзе, зьмяшчаюцца зводкі выкананьня прамфінпляну па брыгадах і цэхах

Але трыкутнік заводу ніякай дапамогі брыгадзе не аказаў, на артыкулы насьценгазэты адказу ніякага ня дана. Паасобныя работнікі заводу, як тэхнік РУХЛЕВІЧ і тэхнарук МІЛАВІДАЎ, рашуча выступілі супроць работы рэдкалегіі, паючы яе самымі агіднымі словамі.

І ня дзіва таму, што партыйца ІВАНОВА за разгорнутую ім крытыку ў газэце некалькі месяцаў таму назад са сьлесароў пераявілі на іншую, некваліфікаваную работу.

Бясспрэчна, што ўсе гэтыя факты бясчынства ня могуць забясьпечыць пасьпяховага выкананьня вызначанай праграмы торфаздабычы. Такое заводзкае кіраўніцтва ня здольна стаць на чале ініцыятывы і актыўнасьці рабочых мас.

Брыгада «Зьвязды»:
Кацнэльсон, Фэйгенсон, Маліноўскі.

ЗДАБЫЧА ТОРФУ за 21 ліпеня

Ідуць наперадзе	
«Ленінскі шлях»	105,9 проц.
«1 мая»	91,8 »
«Чырвоны тарфянік»	87,0 »
«Давыдаўка»	75,8 »
«Міхаловічы»	72,4 »
Адстаюць:	
«Рэмізава»	6,4 »
«Смалявічы»	11,5 »
«Чырвоная Беларусь»	12,6 »
«Зьвязда»	18,5 »
«Калектыўная праца»	20,4 »
«Вялікі мох»	24,4 »
«Чырвоны сьцяг»	37,1 »
«Асінторф»	44,8 »
Імя Даўмана	46,1 »
«Бальшавік»	49,7 »

Па сэзоняным заданьні

Ідуць наперадзе	
«Ленінскі шлях»	65,9 »
«Чырвоны тарфянік»	62,6 »
«Закрашынскі мох»	52,2 »
«Новая Беларусь»	50,4 »
Адстаюць	
«Вольніца»	0,7 »
«Рэмізава»	1,0 »
«Смалявічы»	1,5 »
«Вялікі мох»	2,2 »
«Чырвоная Беларусь»	2,5 »
«Калектыўная праца»	9,5 »
«Чырвоны сьцяг»	14,0 »

Па Белторфе

За 19 ліпеня	28,9 »
» 20 »	33,1 »
» 21 »	46,4 »

Сыгналы „Зьвязды“ пачуты

Культмасавая работа на Асінторфе пачала разгортвацца

Пасьля шматлікіх сыгналаў «Зьвязды» пачала разгортвацца культмасавая работа на Асінторфе.

Прыведзена ў парадак і папоўнена новай літаратурай заводзкая бібліятэка. У цэнтральным пасёлку абсталявана добрая хата-чытальня. Па ўсіх іншых пасёлках арганізаваны чырвоныя куткі. У рабочых інтэрнатах пастаўлены «чырвоныя сталы», якія забясьпечваюцца бібліятэкамі-перасоўкамі, газэтамі, шашкамі і іншымі гульнямі.

Брыгада «Зьвязды»:
Кацнэльсон, Фэйгенсон, Маліноўскі.

ГАРОДНІНУ—ПРАЛЕТАРСКІМ ЦЭНТРАМ

Прыгарадныя саўгасы затрымліваюць вываз гародніны ў Менск

Яны карыстаюцца навыразнымі фармулёўкамі дагавораў на здачу прадуктаў

Пакончыць з месьніцтвам у загатоўках гародніны
Удасканаліць заключаныя з саўгасамі дагаворы

Ня гледзячы на стопроцантнае выкананьне прыгарадныя саўгасамі і калгасамі пляну пасеву гародніны, ня гледзячы на тое, што пад канец ліпеня раньняя гародніна і бульба ўжо пасьпелі,—паступленьне іх ідзе вельмі слаба. Менск забясьпечан гародніной усяго на 20-25%.

Дзе прычыны такога недапушчальнага зьявішча? Брыгадзе «Зьвязды» і Наркамснабу ўдалося выявіць вінаватых у зрыве забесьпячэньня Менску гародніной.

Брыгада наведала прыгарадныя саўгасы «Вольная праца», «імя Лекерта» і «Чырвоны Маяк». І што-ж аказалася? У той час, як у гэтых саўгасах сьпелай бульбы і гародніны ёсьць у колькасьці, якая магла-б задаволіць увесь Менск, кіраўніцтва гэтых саўгасаў выдумвае розныя прычыны, як «няма людзей і часу, няма коняй» і т. д., і гародніну, згодна заключаных дагавораў, у Менск не прысылаюць.

У дагаворах, якія заключаны паміж саўгасамі, Белкаапсольаб'яднаньнем, ЦРК і ЗРК, ёсьць пункт, дзе гаворыцца, што здача раньняй гародніны і бульбы праводзіцца ў час з 1-га ліпеня па 1-га верасьня. У дагаворы не прадугледжана, колькі павінна здавацца ў кожную дэкаду. І таму некаторыя дырэктары саўгасаў «зусім спакойны». Яны ўпэўнены, што дагавор будзе выканан, бо яны змогуць паказаную ў дагаворах колькасьць здаць нават у канцы жніўня.

У выніку ў саўгасе «Чырвоны маяк» ужо цяпер ёсьць больш 10 вагонаў бульбы (па коралі), але дырэктар саўгасу, спасылаючыся на ўсялякія «аб'ектыўныя прычыны», ня прымае ніякіх мер, каб бульбу даставіць рабочаму спажыўцу. У гэтым-жа саўгасе ёсьць 50 га гароху, значная частка яго ўжо пасьпела, але гарох стаіць на корані і хутка будзе асыпацца. І ў гэтым вінаваты «аб'ектыўныя прычыны».

Такое-ж становішча і ў саўгасе «Лекерта»; у саўгасе «Вольная праца» раньняй капусты здана ўсяго 0,9%, а раньняй бульбы — 1% пляну. Ня лепшыя паказальнікі здачы гародніны ёсьць і ў іншых саўгасах. І там пануюць месьніцкія настроі.

Такі недапушчальны, чыста бюракратычны фармальны падыход да справы рабочага забесьпячэньня з боку кіраўніцтва саўгасаў заслугоўвае самага рэзкага грамадзкага ганьбаваньня. Па арыўшчыках забесьпячэньня пралетарскіх цэнтраў гародніной трэба рашуча ўдарыць.

Трэба адначыць зусім недапушчальныя адносіны з боку Белкаапгародніны да рацыянальнага разьмеркаваньня паступаючай гародніны ў Менск.

Як яна разьмяркоўвае гародніну, як выконвае дырэктыву партыі і ўраду аб ліквідацыі «хвастоў» перад крамамі, красамоўна гавораць наступныя даныя.

За апошні дзесяцідзеньнік Белкаапгародніна атрымала 29.437 кгр. гуркоў. І вось, ганяючыся за атрыманьнем прыбытку, яна забыла інтарэсы рабочага спажыўца і разьмеркавала гуркі — так: ЗРК швэйнікаў 2060 кгр. (мае 3 крамы), ЗРК мэтэлістаў — 2783 (мае 4 крамы), ЗРК «Бальшавік» — 2.859 (мае 2 крамы), ЗРК «Дрэваапрацоўшчык» — 2.556 кгр. (мае 1 краму), а для сваёй сеткі, якая складаецца толькі з 3-х крам, Белплодагародніна пакінула 18.390 кгр. Адсюль вялікія хвасты і трата часу.

Белкаапгародніна мае 1 інш. «заслугі» ў галіне забесьпячэньня Менску гародніной. Пастановай калегіі Наркамснабу яна абавязвалася да 23-га ліпеня прымацаваць раёны загатовак гародніны да адпаведных гарадоў. Белкаапгародніна ня выканала дырэктывы. Белкаапгародніна ня выканала пастановы гэтай-жа калегіі аб прымацаваньні пасобных рабочых кааператываў да адпаведных калгасаў і саўгасаў на загатоўку гародніны. Стварыўся хаос і поўная абязьлічка. Ні ЦРК, ні ЗРК ня ведаюць месца, дзе яны павінны праводзіць загатоўкі.

Каб забясьпечваць бесьперабойна Менск гародніной, трэба гарпрафсавету паслаць дружыны на капаньне бульбы і гародніны. Адначасова неабходна зараз-жа ўдакладніць наўныя дагаворы на здачу гародніны, каб было прадугледжана, колькі ў кожную пяцідзённку павінна паступаць гародніны. Гародніна і раньняя бульба павінны паступаць у Менск у такой колькасьці, якая-б поўнасьцю задаволіла патрэбнасьці працоўнага насельніцтва і грамадзкага харчаваньня.

Брыгада «Зьвязды» і Наркамснабу
Левін, Гентман, Сьцяпура.

ЦЭМЗАВОД ПЕРАВЕДЗЕН НА УДАРНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ

ДЭЛЕГАЦЫЯ БУДАЎНІКОЎ У тав. ГЕЯ

Тэмпы работ на будаўніцтве крычаўскага цэмэнтнага заводу нарастаюць спаба. На 1-га ліпеня выкарыстана ўсяго 28 проц. сродкаў, адпушчаных на будаўніцтва, а па спэцыяльных работах — на 9 проц.

Яшчэ дагэтуль ня прыступлена да мантажу абсталяваньня. Апошняе паступае з перабоямі і няпоўнымі камплектамі.

Замест 1.500 рабочых на будаўніцтве занята 600. Рабочае забесьпячэньне ўсё яшчэ не наладжана. Партыйна-масавая і прафэсыянальная работа не разгорнута.

Гэтымі днямі дэлегацыя з Крычаўскага цэмзаводу была прынята першым сакратаром ЦК КП(б)Б тав. ГЕЕМ, які праявіў жывейшы інтарэс да патрэб будаўніцтва.

Усе рабочыя будаўніцтва пераводзяцца на забесьпячэньне па першай катэгорыі, арганізуецца закрыты рабочы кааператыў. Для ўзмацненьня вярбоўкі рабсілы і заключэньня дагавораў з калгасамі для заводу прымацаваны ў раёны, апрача крычаўскага.

Першая рабочая больніца ў Менску

У сувязі з пераходам клінік БДУ ў клінічны гарадок, 1-ая савецкая больніца ператварэцца ў РАБОЧУЮ БОЛЬНІЦУ, якая ставіць сваёй мэтай абслугоўваньне прамысловага і сельска-гаспадарчага пралетарыяту.

У корані зьмяняецца самы характар мэддапамогі. Больніца будзе шырока абслугоўваць вытворчасьць, весьці барацьбу з траўмамі і няшчаснымі выпадкамі на прадпрыемствах.

Рабочыя, атрымаўшыя калецтва на вытворчасьці, будуць забясьпечвацца ў першую чаргу і ўтрымлівацца ў больніцы, пакуль канчаткова не вучуяюць. Асаблівая ўвага будзе зьвернута на прафілактычныя мерапрыемствы, для чаго больніца будзе зьвязвацца з мэдпунктамі на прадпрыемствах і раённымі амбуляторыямі. Гэта дасьць магчымасьць не абмяжоўвацца адным толькі лячэньнем хворага, а падрабязна вывучыць тыя абставіны, якія выклікалі захворваньне, і павесьці з імі барацьбу.

Распрацован плян культурнага абслугоўваньня прадпрыемстваў. Дактары з рабочай больніцы будуць чытаць на заводах лекцыі аб гігіене, санітарных мерапрыемствах, ахове працы і г. д.

Пры больніцы адкрываюцца курсы па ўдасканаленьні дактароў БССР.

Загадчыкам хірургічнага аддзяленьня прызначаецца д-р ШАПІРА, тэрэпэўтычнага—д-р СІТЭРМАН, гінэкалёгічнага—д-р КЛУМАЎ, кансультантамі — праф. РУБАШОЎ і МЯЛКІХ.

АГЛЯД РАБОТЫ КААПЭРАЦЫІ

ГРАМАДЗКАЕ ХАРЧАВАНЬНЕ— НА СЛУЖБУ ПРАМФІНПЛЯНУ

СТАЛОЎКІ МАГІЛЕВА, РЭЧЫЦЫ І ВУШАЧАЎ ПРАЦУЮЦЬ ПА-СТАРОМУ

„Калі ня падабаецца, можаце ісьці“

МАГІЛЕЎ. Грамадзкае харчаваньне ў Магілеве не перабудавана ў адпаведнасьці з майскай адозвай партыі і ўраду. Ні адна з сталовак не пераведзена на гаспадарчы разрахунак, прамфінпляну сталоўкі ня маюць і працуюць бяз уліку даходу і дэфіцыту. На прадпрыемствах грамадзкага харчаваньня, сацспаборніцтва адсутнічае, не арганізавана ніводнай ударнай брыгады.

У сталоўцы транспартнай каапэрацыі Заходняй чыгункі загадчык Шабэка, яго памочнік Ставэр і кухар Клюеў займаюцца самазабесьпячэньнем. Калі адна з работніц, тав. Шчурыкава выступіла супроць гэтых агідпасьцяй, зажымшчыкі самакрытыкі звольнілі яе. Праўленьне ТСТ і прафарганізацыя не рэагавалі на гэты факт.

Адносіны да наведвальнікаў грубыя. Аднаму рабочаму на яго скаргу адказалі: «Калі вам не падабаецца, дык можаце ісьці».

Кіраўніцтва грамадзкім харчаваньнем не адпавядае свайму прызначэньню і не спраўляецца са сваёй работай.

З усіх сталовак Магілева толькі дзьве — №№ 5 і 20 — паказваюць прыклад, як трэба працаваць. У гэтых сталоўках чыста, прадукты захоўваюцца ў ледніках у скрынках. Адносіны служачых да наведвальнікаў добрыя. Якасьць стравы адвавальнаючая. Працдысцыпліна ў сталоўках на належнай вышыні.

Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы энэргічнай рабоце загадчыка сталовак, вылучэнкі-ўдарніцы тав. Глебавай.

Аб'яднаная брыгада «Зьвязды», ЦСПСБ, Белкаапсаюзу і «Камунара Магілеўшчыны»: Новікаў, Пэўпаў, Смолкіна, Удалінкін, Воранаў, Бялько, Пятрэнка, Фідальман, Дзяцідаў, Шэрман, Левіна, Скапец, Ліўшыц, Даніловіч, Хазанаў.

СПАЖЫВЕЦ ПАТРАБУЕ ДОБРАГА АБЕДУ

ВУШАЧЫ. Вушацкі райспажыўсаюз павінен быў адкрыць чатыры сталоўкі. У колькасных адносінах плян выкананы, але райсаюз зусім не аддае ўвагі якасьці работы сталовак. Ні адна з існуючых сталовак (апрача мяст. КУБЛІЧЫ) не адпавядае свайму прызначэньню.

Сталоўкі пры калгасах «ЧЫВОНАЕ СЯЛО» і «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» працуюць дрэнна не таму, што не хапае прадуктаў, а з-за нядбайнасьці іх кіраўнікоў. Бруд — неадлучная частка сталовак.

Самая большая сталоўка знаходзіцца ў мяст. Вушачы. Яна штодзённа прапускае каля тысячы сэзонных рабочых і служачых устаноў. Аднак, якасьць абедаў дрэнная. У стравах часта знаходзяць розныя адкіды. Загадчык сталоўкі ВЕРАБЕЙЧЫК па-напляваецьску адносіцца да сваіх абавязкаў і ня цікавіцца паляпшэньнем абедаў.

ЛІПОЎКА Я., ШЭНТМАН М.

Пудра і духі ў парадку прымусовага асартымэнту

Аздаравіць Уваравіцкі райсаюз

УВАРАВІЧЫ. У краме Уваравіцкага райспажыўсаюзу пры продажы тавараў у парадку прымусовага асартымэнту рэалізуюць пудру і духі.

Наогул, становішча ва Уваравіцкім райсаюзе патрабуе неадкладнага ўмяшаньня адпаведных органаў. Старшыня райсаюзу Войтаў акружыў сябе кампаніяй п'яніцтва і займаецца самазабесьпячэньнем.

ГРАМАДЗКАЕ ХАРЧАВАНЬНЕ У РЭЧЫЦЫ НЕ ПЕРАВЕДЗЕНА НА ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК

РЭЧЫЦА. Рэарганізацыя спажыўкаапэрацыі ня ўнесла прыкметнага пералому ў пастаноўцы грамадзкага харчаваньня. Сэкцыя грамадзкага харчаваньня ЦРК яшчэ не аформлена, капіталы ня вылучаны.

Па сталоўцы ЗРК работа за апошні час нават пагоршылася. 17 ліпеня на 2 тыс. абедаў было адпушчана толькі 25 кілё рыбы. Спэцыяльнае абслужваньне ўдарнікаў і стахановцаў ня ўведзена. Сталоўкі на гаспадарчы разрахунак не пераведзены, вытворчыя пляны адсутнічаюць.

Мясцовыя партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі павінны аддаць больш увагі грамадзкаму харчаваньню.

Брыгадзір «Зьвязды»

Другі Усебеларускі зьлёт юных ленінцаў

Сотні лепшых прадстаўнікоў 200-тысячнай арміі юных ленінцаў—делегаты Другога ўсебеларускага зьлёту і тысячы працоўных Менску арганізавана, стройнымі калёнамі, пад чырвоныя шматлікіх сьцягоў зышліся на спартыўкі стадыён, каб распачаць генэральную праверку баяздольнасьці дзіцячай камуністычнай арганізацыі Беларусі, каб агульнымі сіламі вызначыць шлях далейшай барацьбы ўнукаў Ільліча за генэральную лінію партыі.

Стадыён ледзь умяшчае ўсіх тых, хто жадае прыняць удзел у гэтай адказнай рабоце.

Маладая юнацкая энэргія сярэбрам звонкіх бадзёрых песень далёка пырскае ў блакітныя прасторы.

Рантам з трыбуны: «Зважай!»—сілай здаровых маладых грудзей затрубілі фанфары.

Ад імя бюро ЦК ЛКСМБ адкрывае другі ўсебеларускі зьлёт юных піянэраў старшыня дзіцячай камуністычнай арганізацыі Беларусі тав. Рацэвіч:

— Прайшло два гады з таго часу, як партыя пераключыла дзейнасьць юных ленінцаў на практычны ўдзел у барацьбе за пабудову сацыялізму. Зьлёт паказа працоўным Беларусі, як піянэрская арганізацыя змагаецца за сусьветны Кастрычнік.

На трыбуне тав. ЧАРНУШЭВІЧ:

— Цэнтральны камітэт КП(б)Б і ўрад БССР даручыў мне перадаць вам—прадстаўніком 200-тыс. піянэрскай арміі—шчырае бальшавіцкае прывітаньне. Хвалі дружных воплескаў пакацілася па стадыёне.

— Юныя ленінцы! Перад вамі, як і перад усімі працоўнымі Савецкага Саюзу, стаіць адказнейшая задача—ня зьнікаць бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, бязьлітасна перамагаць супраціўленьне абнаглелага клясавага ворага.

Перад вамі ўпэўнена, што вы яшчэ з большай энэргіяй і энтузіязмам будзеце дасягаць яе ў вырашэньні гістарычных задач.

Ад імя ленінскага камсамолу вітае Другі ўсебеларускі зьлёт бальшавіцкай зьмены:

— У цэхах адчуваюць дапамогу піянэраў у барацьбе з прагульшчыкамі, рвачамі, лятунамі, у барацьбе за разгортваньне сацыялістычных мэтадаў работы. Пасьля зьлёту практычны ўдзел піянэраў у справе выкананьня прамфінпляну павінен яшчэ больш узмацніцца.

На трыбуне тав. БЯЛУГА:

— Піянэры многа зрабілі ў справе ажыцьцяўленьня лёзунгаў культурнай рэвалюцыі. Пры актыўнай дапамозе юных ленінцаў мы ператвараем і ператворым усе нашы навучальныя ўстановы ў сапраўдныя вогнішчы камуністычнага выхаваньня.

— Піянэры! У бой за ўсеагульнае навучаньне, ліквідацыю няпісьменнасьці і політэхнізацыю працоўнай школы.

Гучнымі воплескамі ўдзельнікі зьлёту сустрэлі прадста

Год выданьня—XV
№ 291 (4106)
ПАНІДЗЕЛАК, 27 ЛІПЕЯ 1931
Цана нумара 5 кап.
ВЫХОДЗІЦЬ БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І ТЭЛЕФОНЫ
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—6-37,—сакратар—10-74, парт.сакратар—13-80, прамысл.—13-80, сац. земл.—6-19, мясц. інфарм.—6-19, замеж. інфарм.—6-19, начны рэдактар—6-43, ніжэйгрэдная інфармацыя—10-74, кантора аб'яў—781, адд. абвестак—781

У лягэры беларускай контр-рэвалюцыі

Дзеньнік палітычных падзей, якія адбываюцца ўнутры лягеру беларускага нацыянал-фашызму, не адрозьніваецца вялікай рознастайнасьцю і багацьцем зьместу. Здрада, прэвакацыя, прадажніцкая работа на паслугах дэфэнзывы, пастаяннае цкаваньне БССР, выцягваньне з памыйнай ямы ганебненькіх выдумак аб СССР — «новых» бавчак для запаўненьня імі сваіх газэт — вось, прыкладна, зьмест гэтага дзеньніка.

Ня так даўно, у маі месяцы, балота беларускага нацыянал-здрадніцтва аталасілася новымі крыкамі, якія ішлі на гэты раз ад Акінчыца (ёсьць такі рэпэтат, «палітыкан» дробнага пашыбу, але які мае ўжо нямалы вопыт у супрацоўніцтве з віленскай дэфэнзывай). Крыкі гэтыя ўпесьлі некаторую рознастайнасьць у дзеньнік падзей і жыцьця беларускай контр-рэвалюцыі.

У чым, уласна кажучы, справа?

У маі месяцы ад групы Луцкевіча-Астроўскага, «адкалоўся» Акінчыц і стварыў «новую групу». Праўда, гэтая «група» налічвае ўсяго толькі каля аднаго дзесятка чалавек, але як на маштабы Акінчыца гэтага ліку даволі, каб гаварыць ужо ад «імя беларускага народу». Але мы спынімся на гэтым «адколе», на гэтай іх унутранай грызьні, бо яна кідае некаторае сьвятло на тое, што адбываецца ў лягэры беларускага нацыяналізму.

Акінчыц выступіў супроць Луцкевіча з абвінавачваньнямі ў пакражы грошай, якія ідуць ад віленскай дэфэнзывы ў парадку дзяржаўных субсыдый. Луцкевіч абвінавачвае Акінчыца ў шантажы і іншых таму падобных справах. Зусім відавочна, што ні тая, ні другая група ніколькі не палявелі ў результаце расколу і гэтых узаемных абвінавачваньняў. І тыя і другія застаюцца часткамі аднаго і таго-ж беларускага нацыянал-фашысцкага лягеру. Акінчыц сам урачыста заяўляе ў перадавым артыкуле сваёй аднаднёўкі аб тым, што ён стаіць па пазыцыях польскай дзяржаўнасьці і больш таго, што гэтыя пазыкі неабходна, паводле яго высока-аўтарытэтнай думкі, яшчэ больш рашуча абараняць. Гэты дробных спраў майстар наогул гаворачы, вельмі надкі на ўсялякія дэкларацыі і запэўненьні, асабліва калі справа ідзе аб тым, што яшчэ адна такая дкларацыя напоўніць яго кішэню парай соцень новых дэфэнзыўскіх злотых.

Але ў гэтым «адколе» Акінчыца ад групы Луцкевіча ёсьць і нешта, больш сур'ёзнае. Акінчыц атакуе Луцкевіча, «ясны справа. Акінчыц абвінавачвае Луцкевіча ў тым, што ён, моў, не даволі адкрыта і не даволі моцна трымаецца папёнафільскай арыентацыі. Усё гэта стварае новую магчымасьць для Луцкевіча пусьціць у ход новы паток левых радыкальных фраз для прыкрыцьця сваёй нацыянал-фашысцкай, нацыянал-здрадніцкай сутнасьці. У адбіваньні атак Акінчыца Луцкевіч узмоцнена карыстаецца фразай аб мінулым Грамады, прабуючы і на гэты раз спэкуляваць на гэтым слаўным рэвалюцыйным мінулым Грамады для таго, каб з тым большым посьпехам праводзіць супрацоўніцтва з акупантамі, з тым большай актыўнасьцю змагацца супроць нацыянальна - вызваленчага руху — адзінага носьбіта спаўных традыцый Грамады, з тым, каб з яшчэ большай разьюшанасьцю рытаваць інтэрвэнцыю супроць БССР.

Луцкевіч і надалей застаецца далёка больш вопытным палітыканам, чым яго вучань — Акінчыц і таму ён будзе стараццa скарыстаць гэту ўнутраную бойку для таго, каб нажыць на ёй сякі-такі капіталец з новай дэмагогіі і радыкальных фраз.

Арганізацыі нацыянальна-вызваленчага руху і наша брацкая КПЗБ змогуць быстра выкрыць гэту гульню Луцкевіча і ўсяго нацыянал-фашысцкага лягеру. Яны вдолеюць зрабіць так, каб гэты яго капіталец застаўся мёртвым. Масы, якія бачылі многа здрадніцтва і брудных спраў у нацыянал-фашыстаў, не дадуць сябе ашукаць пяскімі фразамі гэтых верных служкаў польскага імпэрыялізму.

Але гэта бойка, як гэта заўсёды бывае калі паб'юцца двое, якія не падзялілі паміж сабою падачку або дэфэнзыўную субсыдыю, выяўляе з вялікай яркасьцю усе «гэраічныя ўчынкі» нацыянал-фашыстаў, увесь той атідны бруд, у якім капошацца гэтыя «презренные» і «проженные» здраднікі і правакатары.

Вось жменька фактаў, якія выкрываюцца ў гарачцы бойкі двух бакоў.

У беларускай віленскай гімназіі — яе нацыянал-фашысцкае кіраўніцтва сыстэматычна акрадвае вучняў. Калі бяднейшая частка вучняў унесла прапанову стварыць стэлоўку — ім было адмоўлена па вельмі «ўважлівых прычынах», а іменна з-за «некультурнасьці вучняў, якія сталоўку ператвораць у шынок». Такім быў адказ Астроўскага і ня менш вядомай яго паплечніцы — Астроўскай.

Ёсьць такое «Беларускае дабрадзейнае таварыства». Яно таксама ў руках Луцкевіча. Па запэўненьнях Акінчыца — Луцкевіч атрымлівае на гэта «таварыства» 2.500 злотых месячна і грошы выдаткоўвае «паводле свайго ўгледжваньня».

Аб рабоце луцкевіцкіх арганізацый Акінчыц паведамляе ў сваёй аднаднёўцы «Праўда», выданай у Вільні 30 мая, наступныя надрабязнасьці:

«На паперы мы маем шмат розных арганізацыяў, але на жаль, мала хто імі цікавіцца і ніхто, апрача «блізкіх» да справы людзей, ня ведае, што там робіцца...

Уся праца гэтых арганізацыяў зводзіцца да таго, што яны ці то прыядаюць асноўны капітал (як, напрыклад, выдавецкае т-ва), ці наогул «кансумуюць» тыя субвэнцыі, якія выдаюцца ад ураду»...

Характэрныя і цікавыя прызнаньні. Па-першае, арганізацыі мёртвыя. А па-другое — адкрытая заява аб субвэнцыях, якія атрымліваюцца ад ураду акупантаў, ураду «пацыфікацыі», тэрору і вайны!

А разам з тым, гэты-ж Акінчыц прызнае, што камуністы працуюць ня толькі з вялікай энэргіяй, але і з вялікім посьпехам. І ніякія дэфэнзыўскія субвэнцыі, якія павінны ўмацоўваць работу беларускіх нацыянал-фашысцкіх арганізацый, ня ў стане разьбіць гэту работу камуністаў. У той-жа аднаднёўцы Акінчыц піша:

«Мы добра ведаем, з якой затратай энэргіі працуюць камуністы ў тым кірунку, каб сыстэматычна разбурваць усялякія нашы арганізацыі, маючы на мэце стварыць хаос і потым, пры дапамозе сваёй сапраўды добра пабудаванай арганізацыі, захапіць уладу і ўвесьці сваю дыктатуру».

Акінчыц з вялікім нездавальненьнем адзначае, што Камінтэрн праяўляе вялікую актыўнасьць у барацьбе за нацыянальныя інтарэсы беларускага народу, што КПЗБ праяўляе вялікую актыўнасьць у справе разгрому нацыянал-фашысцкіх арганізацый. І сродкам супроць узрастаючага камунізму, па яго думцы, павінна зьяўляцца «маральная чыстка» лучкевіцкіх арганізацый і стварэньне «здаровых форм нацыянальных арганізацый».

Няма асаблівай патрэбы спыняцца на гэтых «плянах». Акінчыца зусім відавочна, што кожная такая арганізацыя, створаная ці Луцкевічам, ці Акінчыцам, асуджана на мізэрнае існаваньне, распад і ўнутраное разлажэньне. Бо ўсе гэтыя арганізацыі — агенты польскага імпэрыялізму, супроць якога беларускія народныя масы вядуць упартае нацыянальна-вызваленчае змаганьне.

Унутраная бойка ў лягеры беларускага нацыянал-фашызму яшчэ раз паказвае, як слабы яго ўплывы ў масах беларускага народу і як дарэмны спробы польскіх акупантаў стварыць шырокую нацыянал-фашысцкую арганізацыю па ЗБ, як бязьвыніковы намаганьні саміх беларускіх нацыяналістаў умацаваць свае пазыцыі ў масах.

Зараз у абстаноўцы рэвалюцыйных падзей, якія шпарка разьвіваюцца на ЗБ і ў Польшчы, беларускія нацыянал-фашысты, таксама як і ППС, Бунд, робяць усё, каб разьбіць і дэзарганізаваць рады працоўных, што падымаюцца ўсё актыўней на барацьбу супроць буржуазіі.

Але гэтыя намаганьні здраднікаў ня стрымаюць рэвалюцыйнага напору працоўных мас ЗБ, якія вядуць барацьбу ў саюзе і пад кіраўніцтвам пралетарыяту ўсёй Польшчы за сваё нацыянальнае і сацыяльнае вызваленьне.

Р. Шэлін.

Пад грохат гармат

крочыць гішпанскі Кастрычнік

Бура рэвалюцыйных выступленьняў па ўсёй краіне

МАДРЫД, 24. Учора над СЭВІЛЬЛЯЙ пяталі ванныя аэрапляны з устаноўленымі на іх кулямётамі. На пляцох і на вуліцах гораду расстаўлены кулямёты і гарматы. Пры сутычцы паміж паліцыяй і рабочымі, якія прабавалі вызваліць арыштаваных, забіта 4 рабочых. Цэнтр рэвалюцыйных сіл разбураны артылерыяй. Рэвалюцыянэры атакавалі казармы грамадзянскай гвардыі. Адзін афіцэр гвардыі і адзін салдат забіты.

У АЛІКАЛА—ДЭ-ГВАДАЙРА (правінцыя ,Сэвільлі) адбылася сутычка паміж рабочымі масамі і грамадзянскай гвардыяй: адзін чалавек забіт, многія паранены. У ГЭРОНЕ рабочыя атакавалі казармы грамадзянскай гвардыі. У ЛЯ-РЫНКАНАДО (правінцыя Сэвільлі) адбылася дэманстрацыя жанчын-работніц, якія патрабавалі вызваленьня арыштаваных камуністаў і роспуску грамадзянскай гвардыі. У МАЛАЗЕ будаўнічыя рабочыя абвясьцілі забастоўку салідарнасьці з бастуючымі гарадзкімі рабочымі і служачымі. У ЛАГРОНЬНЕ абвешчана забастоўка салідарнасьці.

Урад і буржуазны друк пашыраюць правакацыйныя чуткі аб тым, што камуністы і анарха-сындыкалісты быццам маюць зносіны з манархістамі. У БАРСЭЛОНЕ пры сутычцы рабочых з паліцыяй, паліцэйскі афіцэр, два паліцэйскіх агэнты і некалькі рабочых параненa. Глава каталонскага ўраду Масіа заклікае рабочых да «перамір'я».

Забастоўка тэлефаністаў працягваецца і пашырылася НА ДЗЯРЖАЎНЫЯ ТЭЛЕФОННЫЯ СТАНЦЫІ. У СЭВІЛЬЛІ, БАРСЭЛЁНЕ І ІНШЫХ ГАРАДОХ ПЕРА РЭЗАНЫ ТЭЛЕФОННЫЯ ПРАВАДЫ. У ВАЛЕНСІЙ забаставалі рабочыя і служачыя электрычных чыгунак. У АРЫЕДО забаставалі гарнякі.

МАДРЫД, 24. З Сэвільлі паведамляюць аб шырокіх ваенных карацельных мерах, якія прадпрымаюцца ўладай для задушэньня рэвалюцыйнага руху. Над горадам нізка пятаюць ўзброеныя кулямётамі аэрапляны. Маса арыштаваных ПРЫСТУПІЛІ ДА РАБОТЫ ВАЕННЫЯ СУДЫ. Бастуючыя прабавалі адбіць арыштаваных, але жанвойнымі была адкрыта страляніна і забіта 4, ў тым ліку старшыня Сэвільскіх анарха - сындыкалісцкіх прафсаюзаў і адзін камуніст.

У порт прыбыла ваенная судна, камандзір якога аддаў загад у выпадку неабходнасьці адкрыць агонь па горадзе. Папсаваны многія тэлефонныя правады. Сёньня быў забіты капітан грамадзянскай гвардыі. Адбываліся напады на паасобных паліцэйскіх. За апошнія двое сутак забіта 11 чал., параненых, зарэгістраваных больніцамі налічваецца 145.

П'ятракы флёт—для задушэньня паўстаньня нэграў

ПАРЫЖ, 23. Газэта францускага аддзяленьня Міжрабпома «Ля Дэфэнс» паведамляе аб паўстаньне 15 тысяч нэграў у Бэльгійскім Конго (бэльгійская калёнія ў Афрыцы). Паўстанцы спалілі ваенныя склады і зьнішчылі сьпісы плацельшчыкаў падаткаў, а таксама рабочыя кантракты. Становішча ў такой меры абвастрылася, што ,бэльгійская ўлада вымушаны была эвакуавацца з раёнаў, ахопленых паўстаньнем. У гэтыя раёны пасланы двэ роты пяхоты і кулямётная часьць. З поваду таго, што пасланыя ваенныя сілы не маглі задушыць паўстаньне, рыхтуецца атака на паўстанцаў паветранымі сіламі (ТАСС).

ПЕРШЫМ У БССР

КЛІМАВІЦКІ РАЁН ПЕРАВЫКАНАЎ ЗАДАНЬНЕ ПА ПАДПІСЦЫ НА ВЁСЦЫ

Рэалізацыя пазыкі на Клімаўшчыне—бліскучы прыклад, як трэба працаваць, лепшы адказ малаверам і ныцікам

Перавыканан сустрэчны плян

Рапарт ЦК КП(б)Б, ЦВК, СНК, НКФ і рэдакцыі „Зьвязда"

НА АСНОВЕ ШЫРОКА РАЗГОРНУТАГА САЦСПАБОРНІЦТВА КЛІМАЎШЧЫНА ПЕРАВЫКАНАЛА СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ. ПА СТАНОВІШЧЫ НА 25-га ЛІПЕНЯ РЭАЛІЗАВАНА ПАЗЫКІ НА СУМУ 511.630 РУБЛЁЎ, ШТО СКЛАДАЕ 102 ПРОЦАНТЫ СУСТРЭЧНАЙ ЛІЧБЫ І 131 ПРОЦ. КАНТРОЛЬНАЙ ЛІЧБЫ, АТРЫМАНАЙ РАЁНАМ (392 ТЫС. РУБ.).

ПА ГОРАДЗЕ, ПРЫ КАНТРОЛЬНАЙ ЛІЧБЕ Ў 151 ТЫС., РЭАЛІЗАВАНА АБЛІГАЦЫЙ НА 199.395 РУБ., АБО 132 ПРОЦАНТЫ. НА ВЁСЦЫ РЭАЛІЗАВАНА АБЛІГАЦЫЙ НА СУМУ 312.235 Р., АБО 130 ПРОЦАНТАЎ КАНТРОЛЬНАЙ ЛІЧБЫ.

ПРАДАНА АБЛІГАЦЫЙ ЗА НАЯЎНЫ РАЗРАХУНА НА 4.225 РУБЛЁЎ, АФОРМЛЕНА ПЕРШЫМІ ЎЗНОСАМІ ПАДПІСКА Ў РАЗЬМЕРЫ 62 ТЫСЯЧЫ РУБЛЁЎ.

ЧАКАЕМ АДКАЗУ НА НАШ ВЫКЛІК АД КОЙДАНАЎСКАГА, МСЬЦІСЛАЎСКАГА, КРЫЧАЎСКАГА І КАСЬЦЮКОВІЦКАГА РАЁНАЎ.

РАЙКОМ КП(б)Б ЛОЦМАНАЎ.
РВК ШАКУРЫН.
РАЙАШЧАДКАСА СЛУЦКЕР.
РЭДАКЦЫЯ «КАМУНЫ» ЛЫЧКОЎСКІ.

Аднаасобнікі не ахоплены пазыкай

ЖЫТКАВІЧЫ. (Наш. кар.). Да 20-га ліпеня па Жыткавіцкім раёне рэалізавалі на аблігацый пазыкі на 112.740 р., або 65,9 проц. кантрольнай лічбы.

Сярод рабочых і служачых рэалізавана аблігацый на 127 проц. заданьня, сярод калгасьнікаў — 53 проц., сярод ед сярод аднаасобнікаў — на 6,4 проц. заданьня, сярод неарганізаванага насельніцтва — на 1,3 проц.

Такім чынам, асабліва дрэнна ідзе падпіска сярод аднаасобнікаў і неарганізаванага насельніцтва мястэчка.

Найлепшыя вынікі па падпісцы сярод аднаасобнікаў даў «ВЕТЧЫНСКІ І БРАНІСЛАЎСКІ сельсаветы, якія рэалізавалі каля 16 проц. кантрольнага заданьня.

Надзвычай дрэнна працавалі Бялеўскі і Руднянскі сельсаветы, якія правялі падпіску сярод аднаасобнікаў толькі на 0,3 проц. кантрольнай лічбы.

У галіне падпіскі сярод калгасьнікаў найлепшых вынікаў дабіўся ЮРКЕВІЦКІ сельсавет, які поўнасьцю выканаў кантрольную лічбу.

У выніку растлумачальнай работы

Агітбрыгада ў складзе т. т. Берэзьніча, Кучэрыжкі, Рэмукова і Сакуркаль, якая аб'ехала вёскі Карменскага раёну і праводзіла гутаркі з калгаснікамі і аднаасобнікамі, дабілася значных посьпехаў у рэалізацыі пазыкі.

На камбінат на перапрацоўку ліну брыгада прыняла мітынг, пасьля чаго прадала аблігацый на наўмны разрахунак на 45 руб. апрача 100 проц. заданьня тыцкай пазыкі. У 6-й Ліда-Пукальнай партыі вучэдку пасьля агульнага сходу праведена падпіска на 4.000 руб. У калгасе імя Дзяржына на 4.000 сяодзена аблігацый на 55 руб. У калгасе «Новы сьвет» пасьля шырокай растлумачальнай работы 197 вясьнякоў падпісаліся на месячны заход, што складае каля 3.000 руб. У калгасах «Спартак», імя Будзённага праведзен вечар на ладзі з гутаркай наконт пазыкі, пасьля чаго камсамольцы падпісаліся на 600 рублёў. На гэтым жа вечары аднаасобнікі ўзялі за наўмны разрахунак на 60 рублёў.

Брыгада выехала для далейшай работы ў вёскі Прапойскага раёну.

Апошні тэрмін—1 жніўня

Савет Народных Камісараў БССР заслухаў даклад аб рэалізацыі пазыкі «3-ці рашаючы» на вёсцы. СНК адзначыў ВЕЛЬМІ ПАВОЛЬНЫЯ ТЭМПЫ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ. Райвыканкомы і Белкалгасцэнтр дагэтуль не забясьпечылі сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў падпісной кампаніі сярод калгасьнікаў. Большасьць РВК недавацаніла ролі аднаасобнага сэктару ў галіне рэалізацыі пазыкі.

У мэтах бязумоўнага скончэньня кампаніі па падпісцы на пазыку на вёсцы ў ліпені, СНК БССР абавязаў усе райвыканкомы мабілізаваць грамадзкасьць на правядзеньне кампаніі рэалізацыі на вёсцы, асабліва сярод аднаасобнага сэктару з тым, каб да 1-га жніўня заданьне было выканана поўнасьцю.

Белкалгасцэнтру даручана зараз-жа прапанаваць раённым калгасаюзам узмацніць рэалізацыю пазыкі сярод калгасьнікаў, дабіўшыся поўнага ахопу іх падпіскай у разьмеры ня менш трохтыднёвага даходу кожнага калгасніка. Тыя калгасы, якія скончылі падпіску, павінны выпучыць ударныя брыгады для правядзеньня рэалізацыі пазыкі сярод індывідуальнага сэктару і калгасаў, узяўшы іх на грамадзкі буксір.

СНК адначыў поўную бязьдзейнасьць машына-трактарных станцый у галіне рэалізацыі пазыкі на вёсцы і прапанаваў беларускаму аддзяленьню Трактарцэнтру прыняць усе меры да актывізацыі работы машына-трактарных станцый у адносінах рэалізацыі.

Усім упаўнаважаным цэнтральных устаноў, якія зараз працуюць у раёнах па іншых кампаніях, прапанавана зараз-жа ўключыцца ў работу па рэалізацыі пазыкі.

Перад баявым аглядам пралетарскіх сіл

Адозва ЦК Кампартыі Францыі да рэвалюцыйнага пралетарыяту Нямеччыны

БЭРЛІН, 24. Тут атрымана адозва ЦК кампартыі Францыі да кампартыі і рэвалюцыйнага пралетарыяту Нямеччыны. У сувязі з надыходзячым днём 1 жніўня ЦК францускай кампартыі выказвае сваю салідарнасьць з нямецкім пралетарыятам. У лісьце заначаецца:

«Мы заўважаем аб рашучасьці рэвалюцыйнага пралетарыяту Францыі разарваць усе імпэрыялістычныя дагаворы, скасаваць ваенныя даўгі і рэпарацыі і зрабіць магчымым аб'яднаньне ўсіх народаў, якія гавораць на нямецкай мове. Мы ня хочам ніводнага пфэнігу ад працоўных нямецкіх мас. Мы ведаем, што іх галеча скарыстоўваецца толькі ў інтарэсах нашых эксплёататараў і павялічвае нашу ўласную галечу».

У адозве далей указваецца: «Мы ня будзем весьці ніякай вайны супроць нямецкіх працоўных. Такая вайна ў інтарэсах буржуазіі нашай і вашай краіны, якая аб'ядналася супроць пралетарскай рэвалюцыі ва ўсім сьвеце і ў першым чаргу супроць СССР. Напярэдадні 1-га жніўня—міжнароднага дня барацьбы супроць імпэрыялістычных войн і супроць антысавецкай інтэрвэнцыяналістскай войны, а таксама барацьбы супроць экамічнага наступленьня капіталу—мы клічам францускіх рабочых выйсьці з прадпрыемстваў на вуліцу, каб дэманстраваць у знак салідарнасьці ў абарону народнай рэвалюцыі ў Нямеччыне.

Нікай жыве салідарнасьць францускага і нямецкага пралетарыяту!

Нікай жыве дыктатура пралетарыяту!

Нікай жыве СССР—наша бацькаўшчына!

Нікай жыве Камінтэрн»!

Паведамленьні.

У СУВЯЗІ З РАБОТАЙ ГАРАДЗКОЙ КАНФЭРЭНЦЫІ РАБОЧЫХ - УДАРНІКАЎ, САКРАТАРЫЯТ МЕНГАРКОМУ ПАСТАНАЎЛЯЕ:

ПАРТДЗЕНЬ 27-ГА ЛІПЕНЯ АДМЯНІЦЬ І ПЕРАНЕСЬЦІ НА 30-АЕ ЛІПЕНЯ.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

Сёньня, 27 ліпеня, у 7 гадз. веч. у Доме Працасьветы адбудзецца адкрыты сход партклектыву працасьветы. Яўка партыйцаў і камсамольцаў абавязкова. Запрашаюцца ўсе асьветнікі гораду Менску.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Першая гукавая мастацкая карціна Пуцёўка ў жыцьцё. Драма ў 34 эпізодах
Інтэрнацыянал — Пач. у 7 г. веч. — КНЯЖНА МЭРЫ. Звыш програм.—кіно-нарыс БДК. Ударны рэйд. Замежны фільм
„СПАРТАК" — Пач. у 7, 9, і 11. Каса—з 5 гадз. — ЧАЛАВЕК, ЯКІ СЬМЯЕЦЦА. У 10 частках

Менскія архітэктурна-будаўнічы і дарожна-будаўнічы тэхнікумы (былы політэхнікум) працягваюць прыём заяў ад жадаючых паступіць у лік студэнтаў, па 20 жніўня 1931 г.
Заявы з анкетай і дакумантамі, згодна правіл прыёму (даведнік НКА БССР), накіроўваць па адрасе: Менск, вул. Карла Маркса, 37.
Дырэктар тэхнікумаў АНОДЗІН

КІНО КУЛЬТУРАД — З 27 ліпеня — НОВАЯ ВЯСЁЛАЯ КАМЭДЫЯ — СТАНЦЫЯ ПУПКІ
Акт 1—дынаміка жыцьця
„ 2—дзіўны багаж
„ 3—сьвят пупкаўскі пакой
„ 4—Сьвіні плодзіцца
„ 5—з кур'ёрскай хутчасьцю
„ 6—разьвязка вузлавога вузла
ПАЧАТАК СЭАНСАЎ: 7, 8-45, 10-30
Касы адкрыты з 5 гадз.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ БУДАЎНІЧЫ І ЭНЭРГЕТЫЧНЫ ІНСТЫТУТ
абвяшчаюць асьвіны прыём на 1-шы курс:
па будаўнічым інстытуце: на аддзяленьні: а) прамысловага (фабрычна-заводзкага) будаўніцтва, б) агра-індустрыяльнага, в) мэлыёрацыі і грамадзянскага, г) апалу і вэнтыляцыі, д) дарожнае—у агульный колькасьці 150 асоб; на вячэрняе аддзяленьне (курсы) па перакваліфікацыі тэхнікаў у інжынэры—60 асоб;
па энэргетычным інстытуце: на аддзяленьні: а) прамысловай (фабрычна-заводзкой электрафікацыі, б) сельска-гаспадарчай электрафікацыі, в) цэнтральных электрычных станцый з цеплатэхнічнымухілам, г) высоковольных перадач—у агульнай колькасьці 125 асоб.
Жадаючыя паступіць павінны падаць на імя дырэктара інстытуту заяву з далучэньнем дакумантаў, згодна правіл прыёму ў ВТНУ і паказаць, на якім аддзяленьні жадаюць вучыцца. Заявы з дакумантамі прымаюцца да 10 жніўня ў канцылярыі інстытуту—г. Менска, рог. Чырвонаармейскай і унівэрсытэцкай № 42-8.
Іспыты праводзяцца з 15 па 20 жніўня.
Падрабязныя правілы прыёму ў інстытуты надру каваны ў газ. „Зьвязда" № 138 ад 14-VII г. г.
Адначасова праводзіцца прыём на ўсе курсы дзённага і вячэрняга рабфаку, згодна правіл прыёму на рабфакі.
ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТАЎ.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЛЯНАВА-ЭКАНАМІЧНЫ ІНСТЫТУТ
(арганізаваны на базе прамысловага, сельска-гаспадарчага і плянавага аддзяленьня Наргасу БДУ і Эйфэка Беларускай сельска-гаспадарчай акадэміі)
АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ ПРЫЁМ
на 1-шы асноўны курс:
1. На аддзяленьне плянавання і народна-гаспадарчага вучоту—50 чал.
2. На прамысловае аддзяленьне—60 чал.
3. На сельска-гаспадарчае аддзяленьне—90 чал.
Інстытут рыхтуе плянавікоў-сынтэтыкаў вышэйшай кваліфікацыі для апарату Дзяржплану і цэнтральных ведамстваў.
Прамысловае аддзяленьне інстытуту рыхтуе плянавікоў-сынтэтыкаў і яго аб'яднаньняў.
Сельска-гаспадарчае аддзяленьне рыхтуе плянавікоў-сынтэтыкаў для НКЗему, буйнейшых калгасаў і саўгасаў па асноўных відах спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі БССР.
На асноўны курс без іспытаў прымаюцца асобы: скончыўшыя курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ і ВТНУ, тэхнікумы, 9-годкі, ФЗВ, прафшколы, агульна-адукацыйныя курсы на базе 7-годкі і іншы адпаведныя навучальныя установы. Усе іншыя павінны трымаць іспыты ў абёме ведаў рабфаку па грамадазнаўстве, матэматыцы, фізыцы, прыродазнаўстве беларускай і расійскай літаратуры.
Асобы, жадаючыя паступіць у інстытут, павінны падаць заяву і прыкласьці наступныя дакументы: а) аб узросьце, б) аб адносінах да вайсковай павінасьці (копія), в) аб адукацыі, г) аб стане здароўя, д) аб сац. і матар'яльн. становішчы паступаючага і яго бацькоў, е) аб выбарчых правах паступаючага і яго бацькоў, ж) для калгаснікаў—даведку ад калгасу, а для аднаасобнікаў адпаведны дакумант аб с.-г. падатку на 1931 г., з) асобы, скончыўшыя тэхнікумы і прафшколы—даведку аб 2-гадовым практычным стажы, і) анкету, засьведчаную праф. або сав. установамі раённага маштабу, к) дзьве фота-карткі і л) на 30 кап. паштовых марак для адказу.
Узрост паступаючага ад 18 да 35 год.
Заявы з дакумантамі накіроўваць па адрасе: г. Менск, Унівэрсытэцкі Гарадок, галоўны корпус, канцылярыя плянава-эканамічнага інстытуту.
Прыём заяў да 25 жніўня.
Іспыты з 25 па 30 жніўня.
Дырэкцыя інстытуту.

УСІМ АЎТА-ГАСПАДАРКАМ.
З прычыны таго, што забесьпячэньне аўта-гаспадарак аўта-часткамі і гумай праводзіцца Беларускім Агенцтвам Аўтарэмснабу у строга плянавым парадку па заяўках аўта-гаспадарак, камандыроўкі прадстаўнікоў аўта-гаспадарак за атрыманьнем гэткіх зьяўляюцца зусім лішнімі, бо паездку з посьпехам можна замяніць шляхам пісьмовага патрэбазьнаўства.
Аб камандыроўках, якія не выклікаюцца неабходнасьцю, будзе даводзіцца да ведама РСІ.
АЎТАРЭМСНАБ.

Менская кантора „СЛЮЗТРАНСУ"
паведамляе ўсіх адкрываючых трузаў, што з 27-VII устанаўляецца наступны парадак прыёму грузаў да адпраўленьня малай скорасьцю:
ГРУЗЫ, якія дастаўляюцца ўласнымі пораваозчыкамі сродкамі з 14 да 21 тавэлны, без папярэдняга згодненьня аб падвозе з Саюзтрансам ПРЫМАЦЦА НА БУДУЦЬ.
Менская кантора сьюзтранс Крылоў.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" — ПРАЦУЕ ШТОДЗЕННА З 12 ГАДЗ. ДНЯ — 3 панядзелка, 27 ліпеня — ТРУКА-ПРЫГОДНІЦКІ КІНО-РАМАН У 4-Х СЭРЫЯХ І 36 ЧАСТАК
2 сэрыі 18 частак у адзін сэанс 2
СТЭНЛЕЙ у НЕТРАХ АФРЫКІ
Пачатак ДЗЕННЫХ СЭАНСАЎ у 2 і 4 ГАДЗ., ВЯЧЭРНІХ » 7 г., 9, г. і 10 г. 45 м.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА — СЭКТАР КНІГАРСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ
ДА МІЖНАРОДНАГА ЧЫРВОНАГА ДНЯ
(першага жніўня).
— Далоў вайну імпэрыялістаў супроць СССР (аборнік) Цана 20 кап.
— Максім Горкі і Ромэн Ролян выкрываюць інтэрвэнтаў. Цана 10 кап.
Самахвалаў—1 жніўня. Цана 7 кап.
Паэгле—Змаганьне работніц капіталістычных краін супроць вайны Цана 20 кап.
Боген—Заходняя Беларусь пад крывавым бізуном польскіх акупантаў. Цана 10 кап.
Дзікен—Як жывецца пралетарыяту ў Англіі. Цана 7 кап.
Данішэўскі—Жыцьцё і барацьба польскага пралетарыяту. Цана 10 кап.
Ніколецьці—Італьянскі пралетарыят пад уладаю фашысцкай дыктатуры. Цана 7 кап.
Іозэф—Рэвалюцыйны ўздым у Вэнгрыі. Цана 20 кап.
Работэ—Барацьба францускіх рабочых. Цана 14 кап.
Хаяма—Рабочы рух у калёніях Усходу. Цана 50 кап.
Рубінштэйн—Сусьветны эканамічны крызіс капіталізму. Цана 85 кап.
Будзін—Контр-рэвалюцыйны мэншавізм на службе інтэрвэнцыі Цана 70 кап.
Кашэн—Францускі імпэрыялізм рыхтуе вайну супроць СССР. Цана 10 кап.
Пястун—У кас і ў іх. Цана 10 кап.
Ляскоў—Буржуазія на фашысцкім шляху. Цана 12 кап.
Дзятрых—Сусьветнае беспрацоўе. Цана 9 кап.
Гаек—Жыцьцё і барацьба Чэха-Славацкіх рабочых. Цана 10 кап.
Продаж утварэцца па ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва, спажывецкай кааперацыі і Саюздруку.

Для здачы АБВЕСТКІ ў газэту „ЗЬВЯЗДА" звяраць па тэл. 7-81

Згубл. партбілет № 0802915, выд. Аршанск. ДК КП(б)Б на імя Чарнасавэ Тодара Лічыць несапраўдным

Украдз. пасьведч. асобы № 345 ад 10-I—31 г. выд. П.П. АДПУ на імя Бародуліна К. Н. Лічыць несапраўдным

ДОМ КАМУНІСТЫЧНАЕ АСЬВЕТЫ імя Карла Маркса
29 ліпеня, у 8 гадз. веч. абгудзецца даклад тав. РЫЎЛІНА на тэму:
«СУСЬВЕТНЫ КРЫЗІС, ПЛЯН ГУВЕРА І ФІНАНСАВЫ КРАХ У НЯМЕЧЧЫНЕ».
Пасьля—масавая частка. Білеты ў гаркоме КП(б)Б і ў чытальні Дому.

ЗСЕЛКІНІ РАЙКАМЗАЛЕЗКАЗ.
ЛІКВІДУЕЦЦА
на аснове пастановы СНК БССР ад 8 ліпеня, г. г.
Усе установы і асобы, якія маюць прэтэнзіі да Хоцімскага райкамзалезказу, павінны прадставіць ліквідацыйнай камісіі ў да 15-г. жніўня г. г. Пасьля пазначанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.
Ліквідацыйная камісія райкамзалезказу.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ
ва Ўсебеларускі палітыка-асьветны інстытут
НА 1931-32 НАВ. ГОД
Палітыка-асьветны інстытут мае мэту падрыхтаваць палітасьветных працаўнікоў в вышэйшай кваліфікацыяй па асобных галінах палітасьветнай працы.
У адпаведнасьці з гэтым ПРЫ ІНСТЫТУЦЕ ІСНУЮЦЬ СПЭЦЫЯЛЬНЫЯ АДДЗЯЛЕНЬНІ: 1) Арганізацыйна-інструктарскае. 2) Бібліятэчнае. 3) Масавай палітыка-асьветнай працы.
На 1-шы курс без іспытаў прымаюцца асобы, скончыўшыя курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ, ВТНУ, тэхнікумы, 9-годкі, ФЗВ і інш. раўналежныя ім навучальныя установы. Усе іншыя павінны трымаць іспыты ў абёме ведаў сярэдняй школы.
У палітыка-асьветны інстытут на аддзяленьні арганізацыйна-інструктарскае і масавай палітыка-асьветнай работы прымаюцца партыйцы і камсамольцы, якія маюць ня менш, як 2-гадовы стаж актыўнай партыйнай, камсамольскай або грамадзкай працы.
На бібліятэчнае аддзяленьне прымаюцца і беспартыйныя з 2-гадовым стажам грамадзкай працы.
Узрост паступаючых ад 17—35 год.
У інстытут ня прымаюцца асобы з заразьлівымі хваробамі, хворыя на трахому, у клінічнай форме, сухотамі і зусім фізычна слабыя.
Паступаючыя ў палітыка-асьветны інстытут павінны падаць на імя рэнных і гарадзкіх камісій, што існуюць пры райкомах і гаркомах КП(б)Б, заяву з паказаньнем аддзяленьня і далучыць наступныя дакументы: 1) аб узросьце, 2) адносінах да вайсковай павіннасьці (адбітак), 3) аб асьвеце, 4) аб стане здароўя, 5)